Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№196 (28560)
11 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 9–16



Электраэнергія стане таннейшай
СТАР. 4



Сакрэты лодачнага майстэрства
СТАР. 5



Келля ў Гомельскай бібліятэцы
СТАР. 7

## НА ДЗЕДАВАЙ ЗЯМЛІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Козлікі — адзіны жылы хутар у Налібоцкай пушчы на Валожыншчыне. На хутары — тры падвор'і, якія месцяцца далёка адно ад аднаго і належаць Мазалеўскім, Солтанам і Мазурам. Цяпер тут засталіся немаладыя гаспадары, дзеці, і тым больш унукі якіх жывуць у гарадах альбо ў навакольных вёсках абапал пушчы. Здавалася, жыццё на гэтых лясных куточках паціху згасае. Аднак, думаючы так, я памыляўся. Тры гады таму на адной сядзібе пасяліўся малады, цягавіты да працы і надзвычай пазітыўны, ініцыятыўны чалавек Алег ПРОТАС — унук Сігізмунда і Соф'і Солтанаў. Малады запал, смеласць брацца за любую работу і цікавыя планы на будучыню прывялі Алега на дзедаву зямлю. Мужчына вырашыў распачаць свой сялянскі лад. Не як фермер і не як прадпрымальнік, а наладзіць звычайнае хутарское жыццё.**
СТАР. 5

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Марыяна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын»:**

*«Апошнім часам у Беларусі вялікая ўвага ўдзяляецца жаночаму прадпрымальніцтву. У пытаннях забеспячэння занятасці жанчын, у тым ліку ў прадпрымальніцтве, важная падтрымка дзяржавы. Але калі мы, жанчыны, хочам развіваць і ўмацоўваць эканоміку, ствараць працоўныя месцы, быць шырэй прадстаўленымі ў сферы прыняцця рашэнняў, — трэба стаць больш актыўнымі, працаваць разам. Спадзяюся, што па выніках міжнароднай канферэнцыі «Жаночае прадпрымальніцтва як фактар устойлівага развіцця» будуць выпрацаваны рэкамендацыі для магчымых змяненняў у нацыянальным заканадаўстве».*

■ Акцэнт на здароўе

## ВАМ ПРЫШЧЭПКА!

### Кастрычнік-лістапад — час штогадовай вакцынацыі ад грыпу

**Сезонны ўздым вострых рэспіраторных інфекцый і грыпу прыпадае ў нашай краіне, як правіла, на канец студзеня — пачатак лютага, аднак цягнуць з прышчэпкай абсалютна не варта, бо да таго часу ва ўсю разгуляюцца шматлікія рэспіраторныя інфекцыі, якіх і акрамя грыпу дастаткова. Своечасовая вакцынацыя здольна абараніць нас ад усіх гэтых непрыемнасцяў. І нават калі ўсё ж такі мы захварэем на грып або рэспіраторную інфекцыю, то перанясём іх у лёгкай форме.**
СТАР. 3



■ Камунальныя стасункі

## КАШТОЎНЫЯ ГІГАКАЛОРЫІ

### Чаму ў розных дамах за цяпло плацяць неаднолькава

**Панядзелак прынёс доўгачаканае цяпло ў некаторыя сталічныя дамы, а на працягу пяці дзён батарэі павінны нагрэцца ва ўсіх кватэрах, а таксама інтэрнатах, гасцініцах, навуковых установах. Даведацца пра графік падключэння свайго дома можна праз чат-бот кантакт-цэнтра ЖКГ сталіцы на партале «Мой Горад» 115.бел.**

— Цяпло падключаюць адпаведна зацверджаным графікам. Штогод у сталіцы гэта адбываецца за пяць дзён. Яшчэ дзесяць пасля гэтага даецца на настройку сістэмы ацяплення Мінска. У прыватнасці, на ліквідацыю пэўных непаладак, накшталт распаветрывання сістэмы, — расказаў **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, прэс-сакратар Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.** — Пасля падключэння ўсіх спажыўцоў цеплавой энергіі правяраецца работа абсталявання і адбываецца яго рэгуліроўка (соплы, шайбы, рэгулятары). Правяраецца таксама прагрэў стаякоў і прыбораў ацяплення з аператыўнай ліквідацыяй выяўленых недахопаў.

Каб не гадаць, у які дзень цяпло наведае вашу кватэру, і не апытваць суседзяў, супрацоўнік Мінжылкамгаса раіць звяртацца да чат-бота. «Я сам ім карыстаўся, мой дом 12 кастрычніка падключаюць».

Рашэнне аб пачатку падключэння цяпла прымаюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы адпаведна чарговасці. Да першай групы адносяцца аб'екты сацыяльнай сферы, якія падключаюць, калі сярэднясутачная тэмпература на працягу пяці дзён ніжэй за 10 °C. Другая група — жылфонд — пачынае абагравацца, калі тэмпература апускаецца ніжэй за 8 °C, адміністрацыйныя будынкі падключаюць да цяпла ў апошнюю чаргу.
СТАР. 4

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9719 | ▼ |
| Еўра | 2,3205 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0339 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0741 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X
17196

# ПРЭЗІДЭНТ НАКІРАВАЎСЯ Ў СОЧЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю, дзе сёння ў горадзе Сочы прыме ўдзел у самітах СНД і ЕАЭС.**

На пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД плануецца разгледзець каля 20 пытанняў, накіраваных на далейшае развіццё супрацоўніцтва ў палітычнай, эканамічнай, культурна-гуманітарнай і іншых ключавых сферах дзейнасці Садружнасці, паведамляе БЕЛТА. Найбольш значным з іх з'яўляецца праект заявы кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў аб падтрымцы інстытута сям'і і традыцыйных сямейных каштоўнасцяў.

Традыцыйна ў парадак дня пасяджэння ўключаны пытанні, накіраваныя на забеспячэнне бяспекі і процідзеянне новым выклікам і пагрозам.

На пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета лідары краін разгледзяць пытанні ў сферы інфарматызацыі, мытнага рэгулявання, канкурэнцыі, натуральных манаполій, прамысловага супрацоўніцтва і міжнароднай дзейнасці.

Адной з ключавых тэм стане абмеркаванне асноўных напрамкаў рэалізацыі лічбавага парадку дня ЕАЭС да 2025 года. Будуць прадстаўлены асноўныя напрамкі міжнароднай дзейнасці саюза на 2018 год. Прэзідэнтаў праінфармуюць аб ходзе ратыфікацыі Мытнага кодэкса ЕАЭС, які павінен уступіць у сілу з 1 студзеня 2018 года.

На разгляд будзе вынесена распараджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета аб падрыхтоўцы дарожнай карты, якая будзе накіравана на гарманізацыю заканадаўства дзяржаў-членаў у сферы рэгулявання дзейнасці суб'ектаў натуральных манаполій.

Яшчэ адно пытанне парадку дня — супрацоўніцтва краін ЕАЭС у сферы прадастаўлення касмічных і геаінфармацыйных паслуг на аснове нацыянальных крыніц даных дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі.

Адна з падагульняючых тэм саміту — аб старшынстве ў органах саюза — Вышэйшым Еўразійскім эканамічным савеце, Еўразійскім міжурадавым савеце і Савеце Еўразійскай эканамічнай камісіі.

■ Тры пытанні да ўлады

# СТАЎКУ — НА ПРАДПРЫМАЛЬНЫХ

## робіць старшыня Асіповіцкага райвыканкама і стварае спрыяльныя ўмовы для вядзення бізнесу



**Павел НАЛІВАЙКА на пасадзе старшыні Асіповіцкага райвыканкама ўсяго два месяцы — з 8 жніўня, але яму не патрэбны быў час, каб азнаёміцца са справамі і адаптавацца ў новых умовах. Яго жыццё цалкам звязана з гэтым горадам. Ён тут нарадзіўся, праходзіў тэрміновую службу, у розныя часы працаваў на заводзе аўтамабільных агрэгатаў, ва ўстанове «Маяк». З 2016-га займаў пасаду першага намесніка старшыні райвыканкама. І вось новы рубеж. Прызнаецца, што адчувае асабістую адказнасць за сваю малую радзіму і збіраецца прыкласці максімум намаганняў, каб дабрабыт землякоў узрастаў, а іх жыццё станавілася больш уладкаваным.**

***— Павел Уладзіміравіч, якое ваша жыццёвае крэда? Чым вы кіруецеся ў сваёй рабоце?***

— Заўтра павінна быць лепш, чым сёння, — такая мая жыццёвая ўстаноўка. Існаваць і развівацца любому прадпрыемству дапамагае наяўнасць матываванага і кваліфікаванага калектыву. Для мяне галоўнае — не дапусціць пагаршэння сацыяльна-эканамічных паказчыкаў у раёне, ствараць спрыяльныя ўмовы і адпаведны клімат для ўмацавання існуючых і ўзнікнення новых прадпрыемстваў, у тым ліку з прыцягненнем замежнага капіталу, забяспечыць занятасць насельніцтва. У людзях перш за ўсё цаню прыстойнасць і накіраванасць на выкананне пастаўленых мэт.

***— На слыху гісторыя, калі вы яшчэ будучы першым намеснікам дапамаглі прыватнаму прадпрыемству выйсці са складанай сітуацыі. Чым завяршылася гэта справа?***

— Цяпер у ваенным гарадку, дзе размясцілася названае прадпрыемства — ТАА «ЭкаАрбаБуд», — ужо адкрыта восем прадпрыемстваў з колькасцю працоўных месцаў ад 3 да 46. Мне вельмі прыемна, што ёсць людзі, якія жадаюць забяспечыць годны лад жыцця не толькі сабе, але і іншым. Гэта наш сярэдні клас, патэнцыял для развіцця раёна.

***— У Асіповічах створаны прыдатныя ўмовы для вядзення бізнесу. Якую ролю адыгрываюць прадпрыемствы малога бізнесу ў развіцці эканомікі раёна?***

— Арганізацыі малога бізнесу фарміруюць каля 15% экспарту раёна і больш за 10% даходнай часткі бюджэту. Больш за 70% новых працоўных месцаў ствараецца ў сферы малога бізнесу. Колькасць юрыдычных асоб у сферы малога бізнесу вырасла з 231 на пачатак 2011 года да 297 на пачатак 2017-га. Сёлета за студзень—верасень у раёне зарэгістравана 19 новых арганізацый. Зарэгістравана 837 індывідуальных прадпрымальнікаў.

Дынамічна развіваецца спажывецкі рынак. За студзень—жнівень аб'ём рознічнага тавараабароту праз усе каналы рэалізацыі склаў 94,1 мільёна рублёў, на душу насельніцтва раёна прададзена тавараў на суму 1 966 рублёў — першае месца сярод сельскіх раёнаў вобласці. За дзевяць месяцаў забяспечанасць гандлёвай плошчай жыхароў раёна склала больш за 610 квадратных метраў на 1000 чалавек, а ў Асіповічах — больш за 750 «квадратаў» пры нарматыве 600.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца абслугоўванню вяскоўцаў. На 1 кастрычніка ў раёне бытавыя паслугі насельніцтву аказваў 181 суб'ект гаспадарання, у тым ліку 24 юрыдычныя асобы і 157 індывідуальных прадпрымальнікаў (114 аб'ектаў). Найбольшы ўзровень у аб'ёме бытавых паслуг раёна займае Асіповіцкі камбінат бытавога абслугоўвання, у склад якога ўваходзяць тры швейныя атэлье, трыкатажны цэх, пральня, майстэрня па рамонце абутку, чатыры цырульні, восем комплексных прыёмных пунктаў. У 144 сельскіх населеных пунктах няма стацыянарных аб'ектаў службы быту, але яны ахоплены выязной формай бытавога абслугоўвання.

**Пытанні задавала Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПАСЕ абрала старшыню Асамблеі



Парламенцкая Асамблея Савета Еўропы (ПАСЕ) прастай большасцю ў трэцім туры абрала кіпрскага парламентарыя Стэлу Кірыакідзес кіраўніком арганізацыі. За яе прагаласавалі 132 дэпутаты. Кірыакідзес будзе ўзначальваць Асамблею да студзеня 2018 года, калі ПАСЕ зноў будзе выбіраць старшыню, але ўжо з новай палітгрупы. Дарэчы, Стэла Кірыакідзес — прадстаўнік дэлегацыі Кіпра ў Асамблеі з 20 чэрвеня 2016 года. Яна з'яўляецца старшынёй камітэта ПАСЕ па сацыяльных пытаннях, ахове здароўя і ўстойлівым развіцці, уваходзіць у статутныя органы Асамблеі.

### Небывалыя лясныя пажары ахапілі Каліфорнію

Стыхія бушуе ў васьмі акругах Паўночнай Каліфорніі. Агонь разбурыў больш за 1,5 тысячы дамоў і прамысловых будынкаў, многія людзі пацярпелі ці прапалі без вестак. Па інфармацыі мясцовых уладаў, агонь і дым сталі прычынай гібелі сама меней 10 чалавек. Каля 20 тысяч жыхароў прыйшлося эвакуіраваць у больш бяспечныя раёны. Засушлівае надвор'е і вельмі нізкая вільготнасць паветра садзейнічаюць хуткаму распаўсюджванню агню. Пажарныя брыгады спрабуюць утаймаваць стыхію ў васьмі акругах на поўначы штата. Усяго за суткі агонь ахапіў плошчу каля 300 кв. км. Ад пажару пацярпелі вінаграднікі, размешчаныя ў даліне Напа. Па звестках уладаў штата, пажары пачаліся каля дзесяці гадзін вечара ў нядзелю, пасля чаго парывы ветру прывялі да хуткага распаўсюджвання агню: месцамі вогненны фронт наступаў з хуткасцю 80 км у гадзіну.

### Калумбійскія паўстанцы зарэгістравалі партыю

Як передае партал Heraldo, у рэгістры нацыянальнага выбарчага савета паўднёваамерыканскай краіны скончана рэгістрацыя партыі, якая атрымала назву «Агульная рэвалюцыйная альтэрнатыўная сіла» (АРАС). Пры гэтым па-іспанску абрэвіятура гэтай арганізацыі цалкам супадае з абрэвіятурай FARC. «Пeратварыўшыся ў «Агульную рэвалюцыйную альтэрнатыўную сілу», FARC уручаюць народу гэтую непераадольную сілу, каб сваімі ўласнымі намаганнямі ён накіраваўся да змен», — сказаў пасля рэгістрацыі партыі адзін з лідараў былых паўстанцаў Іван Маркес. Ён таксама не выключыў, што ў далейшым прадстаўнікі АРАС могуць выставіць сваю кандыдатуру на пасаду прэзідэнта краіны.

### Польскія грыбнікі сарвалі вучэнні амерыканскіх танкістаў



Вучэнні амерыканскіх танкістаў у лесе блізу польскага горада Жагань былі сарваныя з-за нашэсця грыбнікоў. Пра гэта паведамляе нямецкае выданне Der Tagesspiegel. Амерыканскія экіпажы на танках Abrams прыбылі ў ваколіцы горада, аднак небывалы грыбны ўраджай і мясцовыя жыхары, якія накіраваліся на «ціхае паляванне», перашкодзілі ваенным правесці запланаваныя стрэльбы. Плакаты, якія пазначаюць закрытыя зоны, не напалохалі мясцовае насельніцтва. Як вядома, цяпер у Польшчы ў рамках аперацыі Atlantic Resolve разгорнута амерыканская бранятанкавая брыгада колькасцю 3,5 тысячы чалавек, на ўзбраенні якой знаходзяцца танкі Abrams і самаходныя гаўбіцы Paladin.

■ Меркаванне

# БЕЛАРУСЬ — ТАДЖЫКІСТАН: НАРОШЧВАННЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА



**Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон адзначыў днямі сваё 65-годдзе. З гэтай нагоды адбылася размова з беларускім Прэзідэнтам, падчас якой, акрамя віншаванняў, прайшло абмеркаванне бягучага стану і перспектыў беларуска-таджыкістанскіх адносін. Якія яны?**

Нягледзячы на тое, што па колькасці памеры насельніцтва Таджыкістана істотна саступае найбуйнейшым краінам Цэнтральнай Азіі (Узбекістану — амаль у чатыры разы, а Казахстану — у два), краіна з'яўляецца важным удзельнікам міжнародных адносін.

Стратэгічна важным для яе партнёраў з'яўляецца размяшчэнне тэрыторыі Таджыкістана паміж Кітаем і Афганістанам. Асноўным фактарам на цяперашні момант з'яўляецца суседства з Афганістанам, ва ўрэгуляванні сітуацыі ў якім вельмі зацікаўленая сусветная супольнасць. Прычым фактар тэрытарыяльнага суседства Таджыкістана з гэтай краінай саступае другому значнаму фактару ў справе афганскага ўрэгулявання — этнічнай роднасці. Таджыкі з'яўляюцца другой па значэнні этнічнай групай на тэрыторыі Афганістана, складаючы больш за чвэрць насельніцтва краіны, якая налічвае 34 мільёны чалавек. Такім чынам, у Афганістане пражывае таджыкаў не менш, чым у самім Таджыкістане, рассяляюцца яны ў стратэгічна важных для ўрэгулявання раёнах краіны, і без уліку іх думкі краіну са шматгадовага ваеннага крызісу не вывесці. У сувязі з гэтым увагу ў вырашэнні афганскай праблемы сусветная супольнасць звяртае на Таджыкістан, і ён мае асаблівыя адносіны з найбуйнейшымі краінамі свету, зацікаўленымі ў яго садзейнічанні па гэтым кірунку.

Вялікую значнасць магло б мець і суседства з Кітаем, але перашкаджаюць тры фактары. Першы — гарысты характар граніцы, які ўскладняе камунікацыі. Другі — тое, што з кітайскага боку размешчаны не самыя квітнеючыя ў эканамічных адносінах рэгіёны. І трэці — побач размешчаны Пакістан, у якога з Кітаем выбудаваны вельмі цесныя адносіны, і ў сілу чаго ён з'яўляецца для Пекіна значным камунікацыйным вузлом на шляху ў вельмі важны для міжнародных камунікацый Адэнскі заліў, засланяючы аналагічныя магчымасці для Таджыкістана. Тым не менш Кітай не схільны забываць ні аб адным са сваіх суседзяў, і ўжо актыўна інвестуе ў здабычу газу на тэрыторыі Таджыкістана, а таксама з'яўляецца адным з яго найбуйнейшых крэдытораў.

Для Беларусі Таджыкістан па-ранейшаму важны як адна з частак былога СССР, з якой у нас былі развітыя цесныя адносіны ў савецкія гады. У Мінску вельмі перажывалі ў 1990-я, калі краіна апынулася ў сітуацыі грамадзянскай вайны, якая прынесла вялікія людскія страты і велізарныя эканамічныя наступствы для яе. Частка бежанцаў тады апынулася і ў Беларусі, нягледзячы на некалькі дзяржаўных граніц, што ўзніклі пасля распаду СССР паміж Таджыкістанам і Беларуссю, нагадваючы пра тое, як цесна былі звязаны былыя саюзныя рэспублікі.

Тавараабарот Беларусі і Таджыкістана мог бы быць істотна большы. Па выніках 2016 года беларускі экспарт склаў 17,6 мільёна долараў, а імпарт — 2,6 мільёна. У студзені—ліпені 2017 года тавараабарот вырас больш чым у два з паловай раза ў параўнанні з аналагічным перыядам папярэдняга года, склаўшы 25,6 мільёна долараў. Імпарт з Таджыкістана склаў толькі 2,1 мільёна долараў, што робіць гандаль выгадным для Беларусі, фарміруючы вялікае станоўчае сальда.

Суседства Таджыкістана з Афганістанам з'яўляецца і для Беларусі важным фактарам. У жніўні 2017 года адбыўся першы бізнес-форум «Беларусь — Таджыкістан — Афганістан», на якім прысутнічалі вядучыя машынабудаўнічыя холдынгі краіны, сярод якіх былі БелАЗ, МАЗ, «Амкадор», «Гомсельмаш», «БелОМА», а таксама і асобныя прадпрыемствы накшталт УП «Мінскінтэркапс», «Мінскі завод безалкагольных напояў», ТАА «Пажснаб». Мы разлічваем на тое, што сваяцкія сувязі таджыкскага народа праз афганска-таджыкістанскую граніцу дапамогуць Беларусі ўнесці свой уклад у аднаўленне эканомікі Афганістана.

Беларусь гатова актыўна паўдзельнічаць і ў развіцці эканомікі непасрэдна Таджыкістана. У верасні гэтага года магчымыя праекты ў галіне прамысловай кааперацыі абмяркоўваліся на сустрэчы міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Таджыкістана ў Беларусі Казідаўлатам Каімдодавым.

Таксама адным з галоўных пытанняў парадку дня з'яўляюцца перагаворы аб магчымасці ўступлення Таджыкістана ў Еўразійскі эканамічны саюз, якія вядуцца з боку яго цэнтральных органаў. Выгаднае стратэгічнае становішча і колькасць насельніцтва Таджыкістана з'яўляюцца прывабнымі для павелічэння патэнцыялу ЕАЭС як сур'ёзнага эканамічнага суб'екта на сусветнай арэне. У некаторых ёсць і довады супраць, у прыватнасці, паказваюць на нізкі ўзровень жыцця ў Таджыкістане. Асноўным аргументам за ўступленне з'яўляецца тое, што ўжо прыняты Кыргызстан ненашмат адрозніваецца па эканамічнай сітуацыі, і гэта яму не перашкодзіла пры ўступленні ў ЕАЭС.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# «ЗІМОВЫЯ ІСПЫТЫ» ЎЖО БЛІЗКА

## У краіне распачынаецца акцыя «За бяспеку разам»

**Зіма — суровы экзаменатар, яна бязлітасна праверыць, як чалавек падрыхтаваў сваё жыллё да халадоў. Але, на жаль, не кожны ў стане зрабіць гэта самастойна. Напрыклад, адзінокія старыя, людзі з абмежаванымі магчымасцямі. Асабліва, калі яны жывуць у аддаленых, маланаселеных вёсках, дзе часцяком і дапамагчы ім няма каму. У «групу рызыкі» стала ўваходзяць і сем'і, у якіх дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Менавіта таму кожны кастрычнік МНС Беларусі разам з прадстаўнікамі міністэрстваў унутраных спраў, аховы здароўя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, органаў апекі і папячыцельства, а таксама Беларускага добраахвотнага пажарнага таварыства праводзіць пажарнапрафілактычную акцыю «За бяспеку разам». Сёлета яна пройдзе з 16 кастрычніка па 14 лістапада.**

Аб тым, што ж чакаць падчас яе, расказала **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Настасся ШВАЙБОВІЧ.**

— Акцыя накіравана на тое, каб павысіць культуру бяспекі, папярэдзіць пажары і гібель людзей ад іх як у побыце, так і на працоўных месцах. Невыпадкова яна праходзіць у перыяд, калі людзі пачынаюць масава карыстацца печкамі і іншымі ацяпляльнымі прыборамі. І з-за гэтага істотна ўзрастае колькасць узгаранняў. Напрыклад, летась з-за парушэння правілаў пажарнай бяспекі пры мантажы і эксплуатацыі пячнога ацяплення адбылося 327 пажараў. Яны забралі жыцці 14 чалавек.

Сёлета ратавальнікі правядуць сумесныя рэйды па выяўленні пустых дамоў, абследуюць гарышчы, падвалы, месцы агульнага карыстання ў шматкватэрных жылых дамах. Пад асаблівым кантролем будуць наяўнасць і стан вонкавага супрацьпажарнага водазабеспячэння ў сельскіх населеных пунктах.

Падчас мінулай акцыі ратавальнікі цэнтральнага рэгіёна праверылі больш за 17,5 тысячы прыватных домаўладанняў. Супрацьпажарныя інструктажы прайшлі больш за 22 тысячы чалавек.

— Галоўныя задачы нашай акцыі — праінфармаваць насельніцтва аб стане пажарнай бяспекі, растлумачыць у даступнай форме, што ж будзе, калі на правілы не зважаць, — працягвае Настасся Швайбовіч. — А таксама мы дапаможам мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, іншым арганізацыям у навучанні грамадзян мерам пажарнай бяспекі ў побыце і на вытворчасці.

**Намеснік начальніка ўпраўлення нагляду і прафілактыкі МНС Дзмітрый ТУРЧЫН** зазначыў, што культура бяспекі людзей павышаецца. Пра гэта лепш за ўсё сведчыць тое, што колькасць пажараў і загінулых на іх апошнім часам істотна знізілася, а апошні паказчык увогуле знаходзіцца на гістарычным мінімуме з пасляваенных часоў. Праўда, з пачатку года на пажарах загінулі 318 чалавек (па стане на 9 кастрычніка). На такі ж час летась адпаведная лічба раўнялася 339 смерцям.

Дзмітрый Турчын таксама паведаміў, што ў Беларусі добра падрыхтаваліся да ацяпляльнага сезона, які пачынаецца сёлета даволі рана. Работнікі МНС разам з прадстаўнікамі іншых структур абследавалі больш за 1 млн памяшканняў у жылых дамах і кватэрах. Інструктаж па мерах бяспекі прайшло каля 1,5 млн чалавек. Прыведзена ў адпаведнасць з патрабаваннямі пячное ацяпленне прыкладна 3 тысячы домаўладанняў.

Далучыцца да акцыі «За бяспеку разам» можа кожны чалавек. Калі ў вас у вёсцы жывуць састарэлыя бацькі, то завітайце да іх. Праверце печку, пакіньце запасную батарэйку для аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка. Хто ведае, можа, гэтыя простыя захады дапамогуць уратаваць ім жыццё?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
schklennik@zviazda.by

■ Чулі?

# НАШЫ ГАРНАЛЫЖНЫЯ КУРОРТЫ Ў ТОП-10 СНД

## Сілічы, Лагойск і Якуцкія горы ўвайшлі ў спіс найлепшых месцаў для зімовага адпачынку

**Рэйтынг прадстаўлены аналітычным агенцтвам ТурСтат па выніках аналізу звестак аб ранніх бронях сістэм анлайн-браніравання сродкаў размяшчэння турыстаў у зімовы сезон 2017—2018 года.**



У першую тройку зімовых курортаў краін СНД для гарналыжнага адпачынку і снаўбордынга, папулярных у турыстаў, уваходзяць Шымбулак (Казахстан), Шахдаг (Азербайджан) і Сілічы (Беларусь). Далей ідуць Цахкадзор (Арменія), Чымган (Узбекістан), Каракол (Кыргызстан), Лагойск (Беларусь), Туфандаг (Азербайджан), Алтайскія Альпы (Казахстан). Замыкаюць дзясятку Якуцкія горы (Беларусь).

Танней за ўсё зімовы адпачынак абыдзецца на Чымгане, а даражэй за ўсё — на Шымбулаку. Турыстычны бюджэт адпачынку, уключаючы пражыванне і харчаванне, складзе ў Сілічах, Лагойску і Якуцкіх гарах да $85 у суткі, а на Шымбулаку — больш за $100 у суткі. Зімовы адпачынак на гарналыжных курортах краін СНД плануюць працягласцю ад 7 да 10 дзён.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# ВАМ ПРЫШЧЭПКА!

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Зараз у краіне назіраецца нязначны ўздым інфекцыйнай захваральнасці, характэрны для цяперашняй пары года, адпаведны ўзроўню мінулых гадоў. Што да грыпу, то яго выпадкі пакуль не рэгіструюцца, галоўным чынам, сустракаюцца адэнавірусы і іншыя. Грыпозныя вірусы з'яўляюцца ў студзені, калі яны займаюць да 15—20 працэнтаў усіх рэспіраторных інфекцый.

Паводле слоў **намесніка міністра — Галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Рэспублікі Беларусь Наталлі ЖУКАВАЙ**, каля васьмі працэнтаў насельніцтва ўжо атрымалі прышчэпкі, найбольшая іх колькасць — 10 працэнтаў — у сталіцы. Аптымальнай лічбай для фарміравання калектыўнага імунітэту ў нашай краіне з'яўляецца 40 працэнтаў насельніцтва.

У першую чаргу імунізацыя праводзіцца ў групах рызыкі. 13 працэнтаў людзей з групы рызыкі будуць прышчэплены за кошт рэспубліканскага, а 19 — за кошт мясцовага бюджэту, яшчэ васьмі — за сродкі прадпрыемстваў і арганізацый. Самымі ўразлівымі па магчымасці развіцця ўскладненняў застаюцца дзеці, людзі ва ўзросце пасля 65 гадоў, асобы з хранічнай паталогіяй і цяжарныя. Будучыя мамы ў трэцім трыместры цяжарнасці вельмі цяжка могуць перанесці грып і падвяргаюцца высокай рызыцы гібелі.

Бясплатную абавязковую вакцынацыю атрымлівае і шэраг прафесійных работнікаў, чыя працоўная дзейнасць звязана з вялікай колькасцю кантактаў з іншымі людзьмі.

Шырокамаштабная вакцынацыя праводзіцца ў шэрагу краін, бо з'яўляецца навукова абгрунтаванай. Назіранні ў Беларусі паказваюць, што вакцынацыя 40 працэнтаў насельніцтва забяспечвае выдатны эфект. Уздым захваральнасці ёсць, аднак эпідэміі няма. За апошнія 5—6 гадоў узровень захваральнасці знізіўся ў нас у 15 разоў.

У прышчэпленых адсутнічаюць цяжкія ўскладненні, а хварэе ў гэтай групе наогул 3—10 працэнтаў. Не прыпыняецца работа школ і шэрагу ўстаноў, прадпрыемстваў. Штогадовая ацэнка сістэмнасці вакцынацыі паказвае значнае зніжэнне колькасці звязаных з грыпам выпадкаў часовай непрацаздольнасці, напрыклад, на заводзе «Атлант», Беларускай чыгунцы і іншых.

Лятальных выпадкаў летась не зарэгістравана. Яны мелі месца, як вядома, у 2009—2010 гадах, калі была пандэмія «свінога» грыпу. Выпадкі гібелі былі звязаны тады з цяжкімі пярвічнымі грыпознымі пнеўманіямі. Трэба мець на ўвазе, што грып можа справакаваць любы неспрыяльны фон у арганізме.

Смерць можа наступіць і ад сардэчна-сасудзістага захворвання. Што называецца, не было б грыпу — не здарылася б інфаркт міякарда. Наогул грып адрозніваецца ад іншых рэспіраторных інфекцый якраз высокай рызыкай гібелі хворага і вялікай колькасцю ўскладненняў, спектр якіх досыць шырокі.

Пашкоджанне могуць атрымаць мышачная сістэма, цэнтральная нервовая (энцэфаліт) і г. д.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*



***Чаму некаторым здаецца, што яны захварэлі адразу пасля прышчэпкі?***

— Бывае так, што інфекцыя знаходзіцца ў інкубацыйным перыядзе, чалавек яшчэ не адчувае сябе хворым, і з вакцынацыяй або без яе сімптомы ўсё роўна праявіліся б, — тлумачыць **загадчыца кафедры інфекцыйных захворванняў і дзіцячых інфекцый Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ганна КЛЮЧАРОВА.** — Невялікую сімптаматыку могуць забяспечваць жывыя вакцыны, аднак у нашай краіне прымяняюцца, галоўным чынам, інактываваныя, нежывыя вакцыны, якія пабочных эфектаў не даюць. Проціпаказаннем для прышчэпкі з'яўляецца толькі алергічная рэакцыя на курыны бялок. Таксама нельга з'яўляцца на вакцынацыю ў вострым перыядзе захворвання.

***Чаму людзі адмаўляюцца ад вакцынапрафілактыкі?***

Існуе некалькі распаўсюджаных аргументаў, якія прыводзяць многія з нас, калі адмаўляюцца ад прышчэпкі. Некаторыя кажуць, што праходзілі працэдуру летась. На гэта можна сказаць, што спецыялісты нездарма пастаянна вызначаюць, якія вірусы будуць цыркуляваць у новым сезоне. Высновы, да якіх яны прыходзяць, дапамагаюць правільна сфарміраваць склад вакцын. Усё ж такі грып вельмі зменлівы, а таму і вакцыны павінны мяняцца, каб адпавядаць тым вірусам грыпу, што будуць цыркуляваць. Сёлетнія вакцыны змяшчаюць ужо змененыя штам H1N1, H3N2 і новы штам грыпу В. Усе вакцыны, якія прымяняюцца ў нашай краіне, — аднолькавыя па сваёй эфектыўнасці. Якасць вакцын добрая — яны не даюць пабочных эфектаў, спрыяюць добрай выпрацоўцы імунітэту.

Яшчэ адным аргументам супраць з'яўляецца фраза «Мне не раіў мой урач». Так і хочацца сказаць: вы сапраўды думаеце, што яму гэта патрэбна больш, чым вам? Ёсць яшчэ: «У мяне добры імунітэт, няхай трэніруецца. Калі я і захварэю, то папраўлюся». Мяркую, людзі, якія хоць адночы перанеслі грып у цяжкай форме, хто даведаўся на сваёй скуры, што такое двухбаковая пнеўманія, таксама да пары цешылі сябе магчымай «трэніроўкай». Ну а тым, хто паслухаў сяброў, прачытаў штосьці некампетэнтнае ў інтэрнэце (а такога там цераз край!), варта пажадаць удачы. Дзякуючы іншым прышчэпленым, іх, можа, і пранясе. А можа і не...

■ На слыху

# МЕДДАПАМОГА, НА ШЧАСЦЕ, НЕ СПАТРЭБІЛАСЯ

## Грыбнікі працягваюць блукаць у лясах

**На выхадных ратавальнікі зноў шэсць разоў выязджалі на пошукі людзей, якія заблукалі ў лясах.**

Увечары 7 кастрычніка ў 22.57 паступіла паведамленне аб зніклым у лясным масіве каля вёскі Прыбар Гомельскага раёна пенсіянеру. У 2.45 мужчына выйшаў на святло і гук пажарнай аўтацыстэрны, у медыцынскай дапамозе не меў патрэбы.

8 кастрычніка з 18.57 ратавальнікі Бабруйскага раёна аказвалі дапамогу ў пошуку мужчыны, які прапаў у лесе каля вёскі Ступяні. Той каля 12.30 сышоў па грыбы і заблукаў. У 22.00 ён выйшаў з лесу. Дапамога медыкаў не спатрэбілася.

У той жа дзень у 20.25 ратавальнікі шукалі ў лясным масіве каля вёскі Дзераўно Лагойскага раёна жанчыну. У 21.50 яна выйшла з лесу, у медыцынскай дапамозе не мела патрэбы.

У 21.30 патэлефанавалі лепельскім ратавальнікам: у лясным масіве каля вёскі Слабада згубілася жанчына, якая раніцай адправілася ў лес і не змагла знайсці выхад самастойна. У 23.24 пенсіянерка была знойдзена работнікамі МНС. Дапамога медыкаў не спатрэбілася.

Таксама ў Ляхавіцкім і Пінскім раёнах працягваліся пошукі двух заблукаўшых вечарам 8 кастрычніка мужчын.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ПРАЙШЛА АБЛАВА НА «ВАЎКА»

**Міліцэйскую аперацыю прыйшлося правесці ў Петрыкаўскім раёне, каб злавіць грамадзяніна, які спакусіўся на два спінінгі і іншыя рыбалоўныя прылады аднаго з мясцовых жыхароў, расказаў афіцыйны прадстаўнік УУС Гомельскага аблвыканкама Ігар ГРЫШКЕВІЧ.**

У вёсцы Снядзін у інваліда нехта выдзер дошкі з веранды, каб украсці вуды. Для рыбака, які жыве ў аддаленасці ад райцэнтра, гэта цэлае гора. У кола падазраваных трапіў 28-гадовы мясцовы жыхар, які нядаўна вярнуўся на волю пасля калоніі строгага рэжыму. Мужчына здагадваўся, што яго будуць шукаць, і прымаў меры канспірацыі. Праваахоўнікі некалькі дзён спрабавалі злавіць злодзея, але той пры сустрэчы знікаў у зарасніках і хмызняках. Урэшце, як паведаміў **оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку Петрыкаўскага РАУС Яўгеній ЖУКАВЕЦ**, прыйшлося арганізаваць аблаву з сабакам. Міліцыянеры і дружыннікі прадбачліва акружылі населены пункт адразу з некалькіх бакоў. Менавіта гэта прынесла плён. Калі зладзюжку спужалі ў адным месцы, ён выскачыў у іншым — проста на аператыўніка. Цяпер выкрадальнік вудаў атрымае не толькі за крадзеж. У «залік» яму пойдзе і непагашаная судзімасць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# КАШТОЎНЫЯ ГІГАКАЛОРЫІ

## Тарыф адзін — сумы розныя

Згодна з сацыяльным стандартам тэмпература ў кватэры павінна быць ад 18 °С да 24 °С. Як кажуць спецыялісты, лічбы за ацяпленне ў «жыроўках» залежаць не толькі ад градуса цепланосьбіта і яго колькасці, а і ад катэгорыі дома, дзе вы жывяце. Цяпер такіх катэгорый дзве: уліковыя дамы, у тэхнічных памяшканнях якіх усталяваны групавыя прыборы ўліку цяпла, і безуліковыя будынкі (як правіла, гэта малапавярховікі, дзе тэхнічна немагчыма ўсталяваць такія прыборы).

— У дамах, якія не маюць прыбораў уліку, плата за ацяпленне — пастаянная велічыня з кастрычніка па красавік, незалежна ад таго, якая тэмпература на вуліцы і колькі было затрачана на яе падагрэў, — растлумачыў **Ігар ГАНЧАРЫК, галоўны інжынер ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка»**. — У дамах, дзе групавыя прыборы ўліку цяпла ёсць, плацяць у залежнасці ад таго, наколькі холадна на дварэ. Аўтаматыка прыкрывае (змяншае) падачу цепланосьбіта на дом, калі тэмпература на вуліцы павышаецца, а калі халадае — падача цяпла павялічваецца. Як на вёсцы: чым халадней, тым больш дроў трэба. Гэты групавы прыбор лічыць гігакалорыі цепла免носьбіта. Згодна з гэтымі данымі і выстаўляецца аплата за карыстанне цеплавой энергіяй.

Уліку цяпла — электроннага размеркавальніка. Менавіта ён фіксуе, калі тэрмарэгулятарам абмяжоўваецца доступ цепланосьбіта ў батарэю. Паказчыкі з размеркавальніка здымаюцца абслугоўваючай арганізацыяй, якая пасля заканчэння ацяпляльнага сезона зробіць пераразлік аплаты за ацяпленне.

— Устанавіць пакватэрную сістэму індывідуальнай рэгуліроўкі цяпла можна і ў старых кватэрах, дзе зроблена вертыкальная сістэма разводкі. Толькі гэта будуць не прыборы ўліку цеплаэнергіі, якія паказваюць колькасць цяпла ў гігакалорыях ці джоўлях, а электронныя размеркавальнікі і прыборы выпарнага тыпу (апошніх ужо не так многа), — заўважыў Ігар Ганчарык. — Праўда, для гэтага трэба, каб 75% жыхароў дома былі згодны разлічвацца па паказчыках размеркавальніка. Раней такія прылады ўстанаўліваліся пры капітальным рамонце, пасля на нейкі час гэта работа прыпынілася. І вось ужо з 2010 года мы зноў прапануем падчас капрамонту ў дамах рабіць такую сістэму рэгулявання. Тэрмастатычныя клапаны робяцца за кошт сродкаў на капрамонт, а ўжо кватэрныя прыборы — за кошт жыхароў. А раней уся сістэма рабілася за адлічэнні на капрамонт. Пакуль у сталіцы адрамантавана сем дамоў з такой сістэмай.

### ❍ ТЫМ ЧАСАМ

## ГРАМАДСКІЯ СЛУХАННІ ПА ТАРЫФАХ ЖКГ

### Каб пачынанне запрацавала, трэба зацікаўленасць жыхароў

Збіраць людзей і расказваць ім, з чаго складаецца сабекошт жыллёва-камунальных паслуг і чаму ў «жыроўках» стаяць тыя ці іншыя лічбы. Такую ініцыятыву выказаў **Генадзь КАЛЁНАЎ, выканаўчы дырэктар Міжнароднай асацыяцыі менеджменту нерухомасці (МАМН)**:

— Ідэя ў тым, што вытворца жыллёва-камунальнай паслугі добраахвотна аб'-яўляе пра дзень абмеркавання пытанняў па тарыфах. Такім чынам наладжваецца супрацоўніцтва паміж жыллёвымі асацыяцыямі і камітэтамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Людзі прыходзяць на агульны сход і дэталёва даведваюцца пра сабекошт паслуг, атрымліваюць адказы на пытанні. Такім чынам ва ўласнікаў знікнуць прэтэнзіі да адсутнасці інфармацыі, прападзе агрэсіўнасць і здымуцца многія пытанні. Узамен прыйдзе разуменне, адкуль бяруцца лічбы, і за што дакладна яны плацяць.

Увогуле, гэта ідэя не новая, а практыка, якая ўжо паказала сябе ў Еўропе, гаворыць Генадзь Калёнаў. Як арганізоўваюць грамадскія слуханні ў Латвіі на мерапрыемстве ў Мазыры ў межах «Тыдняў устойлівага развіцця» расказваў і **Юрыс ВІДЖЫС, член праўлення латвійскай асацыяцыі кіраўнікоў, намеснік старшыні праўлення МАМН.** З 2010 года ў Латвіі ўкаранілі інфармацыйную сістэму «Справа дома». Яе сутнасць у тым, што кожны шматпавярховы дом у інтэрнэце мае электронны архіў звестак пра яго функцыянаванне з моманту заснавання будынка. Гэта інфармацыя літаральна аб усім: энергаспажыванне, тэрміны рамонту, нават электронны акт выкананых работ па касьбе травы вакол будынка. Усе звесткі туды змяшчае кіраўнік будынка. Пры гэтым жыхары могуць атрымліваць гэтыя звесткі з любога пункта свету пастаянна, а не раз на год, як у нас, у таварыствах уласнікаў. Такі падыход прывёў да таго, што на сход прыходзяць толькі 0,5% уласнікаў, бо яны, па-першае, і так бачаць усё, што адбываецца з іх уласнасцю, а па-другое, у людзей праз такую адкрытасць зніклі скаргі.

З пазітыўным уплывам грамадскіх абмеркаванняў згодны і ў Мінжылкамгасе, аднак лічаць, што зацікаўленасць у правядзенні такіх мерапрыемстваў павінна быць двухбаковая.

— Грамадскія абмеркаванні добра арганізоўваць, каб людзі разумелі, з чаго складаецца тарыф. Калі чалавеку расказваеш пра гэта, у яго знікаюць пытанні, аднак мы не можам дайсці да кожнага. Мы гатовы працаваць з людзьмі і працуем у пэўнай ступені. У прыватнасці, у сталіцы праводзяцца сустрэчы прадстаўнікоў адміністрацый з жыхарамі, дзе людзям спрабуюць расказаць пра камунальныя паслугі. Аднак жыхары прыходзяць на сустрэчу з надзёнмнымі праблемамі, з тым, што іх хвалюе ў канкрэтны момант: яма ў двары, стыкі працякаюць. Яны проста чакаюць, калі змогуць задаць сваё пытанне. А трэба, каб у жыхароў была зацікаўленасць зразумець, што ім расказваюць, — упэўнены **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, прэс-сакратар Мінжылкамгаса.**

Мы рэгулярна размяшчаем інфармацыю на партале камунальнай пісьменнасці http://gkx.by. Паўгода назад, напрыклад, мы літаральна на малюнках паказвалі, з чаго складаецца сабекошт вады, аднак колькасць тых, хто прачытаў гэтую інфармацыю, мінімальная, людзям гэта не цікава. Яны задаюць пытанне, чаму столькі каштуе вада — у нас жа столькі азёраў, столькі дажджоў? Аднак ніхто не ўнікае і не хоча ўнікаць, што такое працэс падачы вады, што для беларускай вады характэрна высокае ўтрыманне жалеза, і каб зрабіць яе прыдатнай для карыстання, неабходна будаваць станцыі абезжалезвання, а гэта таксама немалыя затраты.

Тэмпература сеткавай вады, якая падаецца на дом, рэгулюецца адпаведна з тэмпературнымі графікамі, зыходзячы з градуса на вуліцы, а таксама вар'іруецца ў залежнасці ад цеплакрыніцы, з якой падаецца носьбіт энергіі. Сам уласнік таксама можа рэгуляваць тэмпературу ў кватэры, з дапамогай тэрмарэгулятара на батарэі абмяжоўваючы доступ гарачай вады ў ацяпляльны прыбор. Гэта дазваляе стварыць камфортны мікраклімат, аднак не ўплывае на памяншэнне аплаты за ацяпленне.

Плаціць адно за рэальна атрыманае цяпло можна толькі пры наяўнасці на батарэях уласніка кватэрнага прыбора

Папярэдне даведацца, колькі давядзецца заплаціць за цяпло, можна, памножыўшы колькасць гігакалорый цепланосьбіта на сучасны тарыф на цеплавую энергію для ацяплення і гарачага водазабеспячэння, які субсідуецца дзяржавай, — 16,9259 руб./Гкал. Дакладная колькасць сёлетніх гігакалорый будзе ясная толькі пасля іх налічэння праз месяц, аднак самыя нецярплівыя могуць узяць за аснову для падліку тую колькасць, што была ў «жыроўцы» ў мінулым кастрычніку. Пры гэтым, заўважыў Ігар Ганчарык, у залежнасці ад тыпу дома плата за ацяпленне ўсё роўна будзе адрозніваца.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Падзея

# І стане электраэнергія таннейшая

## Учора ў Мінску адкрыўся XXII Беларускі энергетычны і экалагічны форум

**У першы дзень форуму пачынае работу Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Энергетыка. Экалогія. Энергазберажэнне. Электра» (EnergyExpo), выстаўка тэхналогій для нафтахімічнай галіны Oil & Gas Technologies, святлотэхнічнай прадукцыі «Экспасвятло», «Атамэкспа-Беларусь», «Водныя і паветраныя тэхналогіі», «ЭкспаГорад». На мерапрыемстве прадстаўлена сучаснае абсталяванне і тэхналогіі для вытворчасці і размеркавання электрычнай і цеплавой энергіі, аўтаматызаваныя сістэмы і рэсурсазберагальныя тэхналогіі.**

Выстаўка EnergyExpo традыцыйна прыцягвае ўвагу вядучых беларускіх і сусветных вытворцаў абсталявання, тэхналогій і матэрыялаў для энергетыкі, экалогіі, энергазберажэння, электратэхнікі і з'яўляецца адной з самых буйных па гэтай тэматыцы ў краінах СНД і Балтыі. Сёлета ў ёй прымае ўдзел каля 300 арганізацый з 16 краін свету.

— За апошнія некалькі гадоў выстаўка значна пашырылася не толькі тэрытарыяльна, але і тэматычна. З'яўляюцца новыя раздзелы і кірункі, якія абмяркоўваюцца ў рамках Беларускага энергетычнага і экалагічнага кангрэса, — сказаў на адкрыцці форуму **намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА.**



Міністр энергетыкі Уладзімір Патупчык паведаміў, што больш за 20 гадоў форум з'яўляецца ўнікальнай пляцоўкай для абмеркавання актуальных пытанняў развіцця энергетыкі і экалогіі, павышэння энергаэфектыўнасці, вывучэння сусветнага вопыту. Гэтае мерапрыемства накіравана на ўкараненне інавацыйных тэхналогій, умацаванне ўзаемавыгаднага і доўгатэрміновага супрацоўніцтва беларускіх і замежных прадпрыемстваў і кампаній, прыцягненне ў краіну інвестыцый.

* * *

Адказваючы на пытанні журналістаў, Уладзімір Сямашка адзначыў, што тарыфы на электраэнергію для рэальнага сектара эканомікі да 2020—2021 гадоў могуць знізіцца на 30%. «Мы ставім задачу зніжэння кошту спажываных нашай эканомікай энергарэсурсаў з цяперашніх 11,3 цэнта за кВт. гадз. да 7,8—7,9 цэнта за кВт. гадз. Гэта задача з улікам запуску атамнай электрастанцыі.

Віцэ-прэм'ер таксама анансаваў зніжэнне тарыфаў на электраэнергію для энергаёмістых прадпрыемстваў, якія рэалізуюць інвестпраекты. «Практыку зніжэння тарыфаў, перш за ўсё для энергаёмістых праблемных прадпрыемстваў, якія рэалізуюць інвестпраекты, мы працягнем у наступным годзе. Рыхтуюцца пералікі такіх прадпрыемстваў, яны разглядаюцца ў сакавіку. Думаю, літаральна да канца месяца мы гэтыя падыходы зацвердзім», — растлумачыў ён. Акрамя таго, для ўсіх спажыўцоў у рэальным сектары эканомікі ў будучыні плануецца на 0,6 цэнта знізіць тарыф на электраэнергію.

А яшчэ Уладзімір Сямашка паведаміў, што Беларусь і Расія да 15 лістапада плануюць абмеркаваць фарміраванне формулы цаны на газ, якая будзе дзейнічаць з 2020 года.

«Да гэтага часу мы мяркуем правесці чарговую сустрэчу, дзе расійскі бок прапануе нам формулу цэнаўтварэння на газ. Мы ўжо правялі з віцэ-прэм'ерам Расіі Аркадзем Дварковічам тры сустрэчы, гэта будзе чацвёртая. Рухаючыся да зблі жэння, мы павінны выйсці на ўзаемапрымальную формулу. Пакуль ёсць пытанні, але гэта рабочыя моманты. Як паказаў папярэдні вопыт, мы ўсё ж такі знайшлі рашэнне на гэтыя тры гады — 2017—2019», — сказаў Уладзімір Сямашка. Ён нагадаў, што ў 2018 годзе цана газу для Беларусі складзе 129 долараў за 1 тысячу кубічных метраў, у 2019-м — 127 долараў незалежна ад кан'юнктуры рынку нафты і газу.

**Міністр энергетыкі Уладзімір ПАТУПЧЫК** у сваю чаргу падкрэсліў, што маштабная мадэрнізацыя аб'ектаў энергетыкі, якая планамерна праводзіцца пры рэалізацыі дзвюх дзяржаўных праграм, дасягнула запланаваных вынікаў. «Спажыўцы Беларусі не адчуваюць недахопу ў электрычнай і цеплавой энергіі, няма перабояў у забеспячэнні прыродным і звадкаваным газам. Пры гэтым наша краіна выступае надзейным партнёрам у галіне транзіту энергетычных рэсурсаў, з'яўляецца актыўным удзельнікам праектаў зніжэння выкідаў на энергетычных аб'ектах, дасягнула самых высокіх на постсавецкай прасторы паказчыкаў у галіне рацыянальнага выкарыстання паліўна-энергетычных рэсурсаў», — адзначыў міністр. За апошнія пяць гадоў удзельны расход умоўнага паліва на водпуск электраэнергіі зніжаны на 33,9 грам умоўнага паліва на кВт. гадз. і склаў па выніках 2016 года 230 грам умоўнага паліва на кВт. гадз., а сёння дасягнуў узроўню 225 грам умоўнага паліва на кВт. гадз.

Работа па мадэрнізацыі галіны працягваецца. Сярод уведзеных сёлета аб'ектаў, дзве самыя буйныя ў краіне гідраэлектрастанцыі — Віцебская ГЭС (40 МВт) і Полацкая ГЭС (21 МВт), а таксама высокаэфектыўны парагазавы блок на Гомельскай ЦЭЦ-1 (35 МВт).

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*



Фота БЕЛТА.

■ Асаблівае ўменне

# ЛОДАЧНЫХ СПРАЎ МАЙСТАР

## На жаль, сакрэты рамяства ўжо мала каго цікавяць...

**...Памятаю, калі яшчэ не хадзіла ў школу, матуля часта брала мяне з сабой у суседні Давыд-Гарадок. Я заўсёды баялася ісці па мосце. Бо я такая маленькая, а ўнізе — шырокая, паўнаводная Гарынь! Яна адначасова і ўражвала, і палохала. А па рацэ на лодках плавалі рыбакі, вудзілі рыбу. Яшчэ шмат лодак стаяла каля берагоў і чакала сваіх гаспадароў, каб каторы раз рассекчы водную роўнядзь Гарыні.**

Цяпер усё не так. З кожным годам вады ў Гарыні становіцца менш, рака высыхае. А некалі такія патрэбныя драўляныя лодкі дажываюць свой век, гніюць на беразе. Ды і гарадчукоў, якія ўмелі майстраваць іх, ужо не засталося, толькі адзін — Міхаіл Паўлавіч Петравец. Да майстра я і вырашыла завітаць.

Міхаіл Паўлавіч — сапраўды, адзіны майстар у Давыд-Гарадку, які цяпер робіць лодкі. Маладыя гэтай справе вучыцца не хочуць, таму што работа вельмі цяжкая і карпатлівая. «Зараз драўляныя лодкі ўжо адыходзяць, усе купляюць сабе металічныя, гумавыя, — дзеліцца гаспадар. — Ды і не кожны зможа зрабіць яе. Колькі майстроў ёсць, якія будуюць дамы, напрыклад, але лодку змайстраваць не змогуць. Тут асаблівае ўменне патрэбна».

Некалі яшчэ дзядуля Міхаіла Паўлавіча рабіў лодкі. Але сённяшні майстар у яго не вучыўся, малы яшчэ быў. Пасля войска, калі вярнуўся, ужо не застаў дзеда. І вучыўся ў аднаго мужчыны, які жыў тут каля ракі.

— У нас была вялікая сям'я — шэсць дзетак у матулі, я — самы старэйшы. Дапамагаў Дзям'янавічу, прыкмячаў, запамінаў, як што рабіць патрэбна. З 1966 года пачаў і сам майстраваць. А ў 1966 годзе і ў 1979-м была вельмі вялікая вада. У кожнага гарадчука мелася лодка, таму што па-іншаму нельга было перамяшчацца. Рака так разлівалася, што вады абапал яе было амаль паўметра, — нават у дамы даходзіла. Каля кожнай хаты стаяла прымкнутая лодка. Калі трэба куды-небудзь трапіць — садзішся ў яе і плывеш па сваіх справах. Вось у тыя часы было вельмі многа заказаў. Мне везлі матэрыялы дзень і ноч. Ледзь паспяваў рабіць лодкі адну за адной. Да таго ж, драўніна была танная, дошак хапала, а зараз усё дорага каштуе.

Апошнім часам Міхаіл Паўлавіч ужо не робіць лодкі, бо няма заказаў. А за ўсё жыццё Міхаіл Петравец пабудаваў іх больш за 370.

Лодку звычайна рабілі з сямі дошчак, нібы сімвал сямі дзён, за якія Бог стварыў усё жывое.

— На пабудову адной лодкі патрэбен тыдзень. Шэсць дзён я працую, а на сёмы ўжо адпачываю. Ды і раней я малады быў, спраўны, руплівы, хуткі, а цяпер — цяжэй, бо ўжо ўзрост уплывае, усё-такі восемдзясят сем гадоў. Лодкі раблю на вуліцы, таму што яны не пралазяць праз вароты. Толькі малыя — у памяшканні, дзе знаходзяцца ўсе мае прылады і спецыяльны станок.

Міхаіл Паўлавіч зараз жыве адзін. Жонка памерла больш за дзесяць гадоў назад. Тут, у Давыд-Гарадку, недалёка жыве дачка. Дапамагае па гаспадарцы і на агародзе: бульбу пасадзіць і выкапаць, памідоры сабраць, у краму ходзіць, есці прыносіць, але Міхаіл Паўлавіч часта сам сабе гатуе. Сын жыве на Урале.



Майстар за работай.



Давыд-гарадоцкія лодкі.

**Лодку звычайна рабілі з сямі дошчак, нібы сімвал сямі дзён, за якія Бог стварыў усё жывое.**

— А ён не пераняў у вас майстэрства будавання лодак? — пытаюся.

— Не. Адразу пасля заканчэння школы паступіў у Пермскі ўніверсітэт, потым быў у войску, там працаваў следчым і даслужыўся да палкоўніка. Цяпер — у запасе.

— А вы на кірмаш у нядзелю ходзіце? — пытаюся я ў гаспадара.

— Не, не хаджу, далёка. Ногі ўжо не пераадолеюць такую адлегласць, дзесяць тры кіламетры. А вось на веласіпедзе еду добра! А што рабіць! У хаце сядзець увесь час сумна, таму хаджу на рыбалку. Таксама шыю на швейнай машынцы. Абутак, курткі, бывае, суседзі прыносяць што-небудзь парамантаваць.

Міхаіл Паўлавіч паказвае пашытыя ім акуратныя чорныя хатнія боцікі са скуранай падэшвай, унутры якіх авечы мех.

І тут раздаецца гук тэлефона. Звоніць дачка.

— Прывітанне, дачушка. Што рабіў? Рыбачыў. Злавіў трошкі акунькоў. Канешне, прыходзь. Не, дзякуй, нічога не трэба, хлеб і малако яшчэ ёсць, і цукеркі таксама. Не, я адпачываць пакуль што не буду.

— Бліжэй да вечара прыйдзе дачка, будзем памаленьку капаць бульбу і саджаць суніцы, — дзеліцца планамі Міхаіл Паўлавіч.

Шкада, што лодачнае майстэрства ў Давыд-Гарадку паступова сыходзіць і не цікавіць сучасную моладзь. А сімвал горада, які здаўна быў своеасаблівай адметнасцю гарадчукоў, адыходзіць у нябыт...

**Марына ЛЯШКЕВІЧ**

# НА ДЗЕДАВАЙ ЗЯМЛІ



Памочнік Алега — пляменнік Анатоль Бадак.



З такім абаронцамі ваўкі не страшныя.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Тут хапае і зямлі, і кармоў — толькі не лянуйся, касі, пасві, даглядай, — кажа Алег, паказваючы мне гаспадарку і сваіх гадаванцаў — адкормленых бычкоў і мітуслівых авечак. — Дзед і баба блаславілі на задуманае. А я тады падумаў, што і яны будуць пад маім наглядам, бо старыя, па дзевяноста ім! На жаль, год таму дзед пайшоў з жыцця.

Алегу цяпер трыццаць шэсць гадоў, ён працуе ў калгасе недалёка ад Івянца, у яго трое дзяцей, але сям'я жыве ў самім Івянцы. Яго мара жыць у вёсцы і займацца сялянскімі справамі часткова спраўдзілася. Узвёў некалькі гаспадарчых пабудоў, трымае цэлую атару авечак — ажно сто трыццаць, некалькі коз, дзесяць бычкоў, у сажалцы плаваюць чароды гусей і качак. На поплаве пасецца незвычайнай плямістай масці жарабец па мянушцы Макс. Па падворку бегаюць дзве дружалюбныя аўчаркі каўказскай пароды — Аза і Арык, якіх Алег завёў для аховы свайёй гаспадаркі — апошнім часам у пушчы развялося шмат ваўкоў, якія смела заходзяць у двары, не баючыся ні чырвоных сцяжкоў, ні ўключанага на ўсю катушку радыё.



Макс — конь асаблівы.





Цяпер Алег Протас будуе гасцявы дом, бо плануе стварыць у Козліках аграсядзібу.

— У наш час модна развіваць турыстычную дзейнасць, асабліва ў такім незвычайным месцы, як Налібоцкая пушча, — кажа Алег. — А дапамагае мне дваццацітрохгадовы сваяк Анатоль Бодак. І, зразумела ж, сілы дае дзедава зямля. Таму, думаю, усё ў нас атрымаецца.

**Анатоль КЛЯШЧУК,**
**фота аўтара.**
*Валожынскі раён.*

***Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by.***

# ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
### на 1 октября 2017 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 29 609 | 28 550 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | – | – |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 81 817 | 98 976 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 25 189 | 110 795 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 308 955 | 288 321 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 542 989 | 620 271 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 388 | – |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 997 | 997 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 45 737 | 47 483 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 4 720 | 1 967 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | – | 494 |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 8 789 | 14 070 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 1 049 190 | 1 211 924 |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | – | – |
| 17 | Средства банков | 1202 | 110 811 | 237 035 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 755 633 | 777 981 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 4 157 | 21 451 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 5 | – |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | – | – |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 22 083 | 20 200 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 892 689 | 1 056 667 |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
Усе знойдзеныя ў парку трафеі належным чынам афармілі і ўладкавалі ў музейны куток. Потым вывучалі знакаміты камень філарэтаў. Ён знаходзіцца недалёка ад вёскі Карчова. Ля яго, паводле падання, сустракаліся члены студэнцкай падпольнай патрыятычнай арганізацыі — Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Ігнат Дамейка і іншыя. Вядома, настаўніку даводзіцца на згаданую тэму праводзіць невялікія лекцыі. Але побач з гістарычным валуном яны ўспрымаюцца і засвойваюцца лепш, чым у класе. Дзеці такім чынам як бы «дакранаюцца» да духоўнай спадчыны свайго краю, спасцігаюць гісторыю краіны праз канкрэтныя эпізоды мінулага малой радзімы.

ВЯЛІКАЯ даследчая работа праводзіцца таксама ў Жамчужненскай сярэдняй школе, дзе і праходзіла пленарнае пасяджэнне сесіі. Вучні настаўніцы Ірыны ДУБЕЙКІ, аўтара кніг па гісторыі Баранавіцкага раёна, не раз атрымлівалі адзнаку на рэспубліканскім узроўні за даследчыя работы. Школа нярэдка станавілася пераможцам абласных і рэспубліканскіх конкурсаў па рэалізацыі розных праектаў. Напрыклад, такіх як праект шостага школьнага дня «Захаваць жыццё на сяле».

стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# НАВУКА, АДУКАЦЫЯ, ФАРМАЦЭЎТЫКА І ТУРЫЗМ

*Названы сферы актывізацыі супрацоўніцтва з Кубай*

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кубы ў нашай краіне Херарда Суарэсам Альварэсам, які завяршае сваю дыпламатычную місію ў Беларусі.**



Спікер верхняй палаты беларускага парламента адзначыў, што супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў у фармацэўтычнай галіне мае сур'ёзны патэнцыял. «Тут яшчэ вялікі пласт пытанняў, якім трэба ўдзяліць больш увагі, каб супрацоўніцтва ў гэтай галіне актывізавалася, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Дзякуючы беларускім магчымасцям можна актыўна прадаваць лекі не толькі на наш рынак, але і на прастору Еўразійскага эканамічнага саюза».

Сярод іншых сфер для сумеснай работы старшыня Савета Рэспублікі назваў навукова-тэхнічную сферу, адукацыйныя праграмы, падрыхтоўку кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі, а таксама турызм. «Гэтыя кірункі можна было б актывізаваць на ўмовах узаемнай выгады», — дадаў ён.

Акрамя таго, Беларусь зацікаўлена развіваць гандлёвыя адносіны з Кубай, падтрымліваючы іх у тым ліку з дапамогай сучасных адпрацаваных фінансавых схем. Дарэчы, на сённяшні момант зацверджаны механізмы рэалізацыі кантрактаў па пастаўцы Кубе айчынных МАЗаў, а таксама сельскагаспадарчай тэхнікі.

— У нас ёсць шмат яркіх прыкладаў, якія паказваюць, што наша супрацоўніцтва з Кубай па-ранейшаму дастаткова стабільнае і прырастае праектамі, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Безумоўна, вы павінны быць упэўнены, што дзякуючы і вашым намаганням, і намаганням беларускага боку мы маем у Лацінскай Амерыцы надзейнага партнёра, які працуе не толькі ў рамках двухбаковых адносін, але і аказвае падтрымку Беларусі ў цэлым у рэгіёне.

Напрыканцы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кубы ў Беларусі Херарда Суарэс Альварэс пацвердзіў, што Беларусь з'яўляецца стратэгічным партнёрам Кубы, таму ў плённым развіцці двухбаковых адносін сумнявацца не даводзіцца.

# НЕАБХОДНЫ ПРАПАНОВЫ

*Навуковая сфера будзе ўдасканальвацца*

**Пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча адбылася нарада, якая датычылася выпрацоўкі прапаноў па ўдасканаленні навуковай сферы Рэспублікі Беларусь.**

У нарадзе ўзялі ўдзел старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь Іна Мядзведзева, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гусакоў, намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Аляксандр Курлыпа, міністр фінансаў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Амарын, міністр працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Ірына Касцевіч, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына Старавойтава.

# БЮДЖЭТНЫ ПАКЕТ У АБМЕРКАВАННІ

*Сенатар узяў удзел у пашыраным пасяджэнні камісіі Палаты прадстаўнікоў*

**У Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў прыняў удзел у абмеркаванні пакета бюджэтных законапраектаў на 2018 год, якое адбылося падчас пашыранага пасяджэння Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах.**

У пасяджэнні таксама ўдзельнічалі намеснікі міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь Юрый Селіверстаў і Дзмітрый Кійко, намеснік міністра па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь Эла Сяліцкая.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*
**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

У РУХУ

# КАМФОРТНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ

## У Мінску падвялі вынікі ўдзелу гарадоў і населеных пунктаў краіны ў Еўрапейскім тыдні мабільнасці (ЕТМ-2017)

**Беларусь толькі трэці год удзельнічае ў ЕТМ, але дынаміка актыўнасці нашых гарадоў уражвае. Калі ў 2015 годзе да тыдня мабільнасці далучыліся толькі Мінск, Полацк і Наваполацк, то ў наступным ужо 19 гарадоў, а сёлета, з 16 па 22 верасня, у акцыі ўдзельнічалі аж 46 гарадоў і населеных пунктаў.**

Адкуль такі імпэт? І навошта нам гэты тыдзень? Чаму старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац летась у прысутнасці дэпутатаў Мінгарсавета, прадстаўнікоў адміністрацый раёнаў, грамадскіх аб'яднанняў, кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый сталіцы падпісаў Хартыю аб далучэнні да Еўрапейскага тыдня мабільнасці?

### З ЧАГО ПАЧЫНАЦЬ?

Мы ўсе за камфортнае жыццё незалежна ад параметраў нашага населенага пункта. Пакажыце таго, хто супраць. Але як стварыць камфорт і з чаго пачынаць? Паводле ацэнак еўрапейскіх экспертаў, якасць жыцця людзей на адну трэціну залежыць ад умоў мабільнасці гараджан ці, інакш кажучы, нашай рухомасці. У тым ліку і ад стану гарадской транспартнай сістэмы, яе надзейнасці, зручнасці, а таксама бяспекі для людзей і навакольнага асяроддзя. З гэтай высновай цалкам згодны **Валерый БАРАДЗЕНЯ, старшыня праўлення грамадскай арганізацыі «Беларускі саюз транспартнікаў», дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.** Яго выступленне «Устойлівы транспарт і ўстойлівая мабільнасць: еўрапейская мода ці патрабаваннне часу?» выклікала вялікі інтарэс ва ўдзельнікаў семінара, дзе і разглядаліся пытанні мабільнасці беларускіх гарадоў. На думку дэпутата, горад у першую чаргу павінен уяўляць сабой прастору для людзей, для іх камфортнага жыцця.

Тэзіс зразумелы і доказаў не патрабуе. Але як яго рэалізаваць? Валерый Барадзеня ўпэўнены: не трэба займацца вынаходніцтвам веласіпеда, калі можна па магчымасці выкарыстоўваць еўрапейскі досвед. Бо вучыцца на чужых памылках танней і прасцей. Акрамя гэтага, еўрапейцы ўжо істотна прасунуліся наперад у справе засваення гарадскога асяроддзя з улікам інтарэсаў усіх жыхароў. Напрыклад, у нямецкім горадзе Дармштаце грамадскі транспарт у выхадныя працуе кругласутачна, што вельмі падабаецца маладым людзям, сярод якіх шмат прыхільнікаў бавіць час на дыскатэках, у начных клубах, на разнастайных вечарынках, якія звычайна заканчваюцца позна. Ёсць начныя ўстановы і для тых, хто хоча правесці вечар у спакойнай абстаноўцы з келіхам піва ці віна. Усім ім падабаецца кругласутачны рэжым работы транспарту, бо людзі вяртаюцца дахаты не за рулём уласнай машыны, а на гарадскім



аўтобусе. У выніку статыстыка аварый па віне нецвярозых вадзіцеляў значна палепшылася.

Удзельнікі семінара, а сярод іх было нямала прадстаўнікоў раённых цэнтраў і невялікіх гарадоў, казалі аб тым, што сёння варта па-новаму арганізоўваць гарадское жыццё. На думку Валерыя Барадзені, мясцовая ўлада павінна выступаць у ролі заказчыка на транспартныя паслугі для сваіх гараджан. А таму надышоў час даць магчымасць мясцовай уладзе выкарыстоўваць новыя інструменты гарадскога планавання і кіравання мабільнасцю. Напрыклад, паступова перадаць грамадскі гарадскі транспарт пад юрысдыкцыю органаў мясцовай улады, якія кантралявалі б дзейнасць транспартнай сістэмы на падведамаснай тэрыторыі.

### У ГЛЫБІНКУ!

Лагішын — гарадскі пасёлак у Пінскім раёне, ён жа цэнтр Лагішынскага пасялковага Савета. Дык вось там, паводле слоў Валянціны Ляончык, нацыянальнага эксперта па правядзенні Еўрапейскага тыдня мабільнасці названая акцыя прайшла на выдатна. Хоць жыхары гарадскога пасёлка ўпершыню далучыліся да ЕТМ, многія з іх па магчымасці адмовіліся ад паездак на аўтамабілі, пераселі на веласіпеды, актыўна карысталіся грамадскім транспартам, больш хадзілі пешшу. У час тыдня прайшлі тэматычныя акцыі, якія таксама выклікалі цікавасць у жыхароў.

І атрымалася ўсё ў многім дзякуючы ўзаемадзеянню пасялковага Савета з Пінскім райвыканкамам, мясцовымі школамі, арганізацыямі БРСМ і прадпрыемствамі. Сёння многія лагішынцы скажуць вам, што мэта тыдня мабільнасці — прыцягнуць увагу грамадскасці да праблем забруджвання паветра і залішняй колькасці аўтамабіляў на вуліцах.

Дарэчы, рух у глыб краіны — сусветны кірунак. Гэты год стаў рэкордным па агульнай колькасці ўдзельнікаў ЕТМ: 2470 гарадоў і населеных пунктаў у 50 краінах свету. І Беларусь знаходзіцца ў трэндзе гэтага руху. У яе гарадах-удзельніках адбыліся самыя розныя мерапрыемствы: грамадскія дыскусіі, велапрабегі, уладкаванне веласіпедных парковак, абследаванне стану атмасфернага паветра і вымярэнне ўзроўню шуму, сумесныя інфармацыйныя акцыі з ДАІ, конкурсы, канцэрты. А таксама прайшлі велаквесты, флэшмобы «Мабільнасць і актыўнасць, здароўе, крэатыўнасць», конкурсы сэлфі, сацыяльнай рэкламы «Мабільнасць і моладзь», курсы па скандынаўскай хадзе і г. д.

### ДЗЕНЬ БЕЗ АЎТО

Што і казаць, у нас уласны аўтамабіль гэта і паказчык паспяховасці яго ўладальніка, і новы ўзровень яго свабоды, і камфорт для сям'і. Як угаварыць такога аўтамабіліста часцей ездзіць на веласіпедзе? Складана. Хоць у Германіі, паводле слоў Валерыя Барадзені, шмат зрабілі ў гэтым кірунку. Там веласіпед, вобразна кажучы, рабочы конь, які актыўна выкарыстоўваецца ў многіх сферах гарадской гаспадаркі.

І тым не менш зрухі ў лепшы бок ёсць і ў нас. Закрыццё Еўрапейскага тыдня мабільнасці прайшло 22 верасня пад лозунгам «Сусветны дзень без аўтамабіля». У многіх гарадах-удзельніках у гэты дзень пры прад'яўленні пасведчання кіроўцы і тэхпашпарта аўтамабіля праезд у грамадскім транспарце быў бясплатны. У Мінску, напрыклад, адпаведнае рашэнне было прынята на сесіі гарадскога Савета. І вось вынік. Летась такой магчымасцю скарысталіся 8,5 тысячы аўтамабілістаў, а сёлета — у два разы больш. Прычым бясплатны праезд дазваляўся і жыхарам іншых гарадоў, вядома, пры наяўнасці патрэбных дакументаў.

Любоў да веласіпеда імкнуліся па-рознаму прывіць у нашых гарадах. У Полацку многія кіраўнікі агітавалі асабістым прыкладам: на работу прыехалі на веласіпедах або на грамадскім транспарце.

Еўрапейцы, адным словам.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**



У ДОБРЫ ШЛЯХ!

# З ВЕТРЫКАМ ПА ГРАВІЙЦЫ...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ПАСЛЯ таго як вуліцы населеных пунктаў Буда-Кашалёўскага раёна трапілі на баланс спецыялізаванай арганізацыі, званкоў ад вяскоўцаў з просьбай адрамантаваць дарогу стала больш. Дырэктар Буда-Кашалёўскага дарожнага рамонтна-будаўнічага ўпраўлення №184 Аляксандр КУДЗЕЛЬКА лічыць гэта станоўчым знакам: людзі адчулі надзею, што іх праблема можа хутка вырашыцца.**

Летась клопат пра стан вуліц Гомельскай вобласці ўзяло на сябе камунальнае праектна-рамонтна-будаўнічае прадпрыемства «Гомельаблбуд». Такім чынам усе транспартныя аўтамабільныя шляхі Будакашалёўшчыны апынуліся пад наглядам спецыялістаў, якіх у народзе называюць «дарожнікі».

— Сёлета работнікі ДРБУ №184 адрамантавалі 11 вясковых вуліц у нашай мясцовасці, — кажа **старшыня Узоўскага сельскага Савета дэпутатаў Алена БЫЛІЦКАЯ.** — Раней самым злабадзённым пытаннем быў якраз рамонт дарожнага пакрыцця. Мясцін, куды б не магла праехаць аўталаўка альбо хуткая дапамога, у нас не сустракалася і тады, але існавалі дарогі, якія размывала восенню і вясной. Былі скаргі ад грамадзян у сельвыканкам. Цяпер жа справа зрушылася, праблемныя ўчасткі адрамантавалі.

У сваіх аднавяскоўцаў дэпутаты Галіна Сотнікава і Аляксандр Кот карыстаюцца павагай за чуласць да праблем жыхароў. Як толькі ўзнікае скарга, стараюцца тут жа вырашыць пытанне — і размыты дажджамі шлях не выключэнне. У любы час дэпутаты тэлефануюць у сельвыканкам, далей праблема па ланцужку адпраўляецца спецыялістам ДРБУ, якія ставяць заяўку на ўлік. Аглядчыкі ад прадпрыемства выязджаюць на месца, ацэньваюць аб'ём і характар работ, пасля чаго на праблемны ўчастак адпраўляюць ужо тэхніку. Хуткасць рамонту залежыць ад яго складанасці. Дарожнікі працуюць з адной вуліцай ад пары дзён да некалькіх месяцаў.

— На баланс нашага ўпраўлення перададзена 240 кіламетраў дарог. З іх прыкладна 140 кіламетраў складае «грунтоўка», якая патрабуе асаблівай увагі, — расказвае Аляксандр Кудзелька. — Яе штораз даводзіцца прафіляваць, грэйдзіраваць, рабіць кропкавую падсыпку. На капітальны рамонт — тым больш пракладку асфальта-бетоннага пакрыцця — у ДРБУ няма сродкаў, але ігнараваць скаргі мы таксама не можам. Апрацоўваем паверхню дарог эмульсіяй і засыпаем шчэбнем. Гэта павялічвае зносаўстойлівасць і дае лепшае счэпліванне калёсаў машын з дарожным палатном. Бягучы рамонт атрымалі вуліцы пасёлка Уза, вёсак Негаўка, Чабатовічы, Калініна... Цяпер многія вяскоўцы ведаюць мой нумар тэлефона, каб званіць напрамую, хоць большасць усё роўна звяртаецца праз сельвыканкам.

З апошнім якраз супрацоўніцтва ў ДРБУ асабліва шчыльнае. Дырэктар прадпрыемства, прадстаўнікі службаў райвыканкама, дэпутаты сельскіх Саветаў некалькі разоў на год праводзяць з вяскоўцамі «жывы дыялог». Гэта форма работы дазваляе сустрэцца з жыхарамі пэўнай вёскі і даведацца пра іх клопаты. Усе заўвагі потым бяруцца на кантроль. Для тых, хто з нейкіх прычын саромеецца задаць пытанне, існуюць ананімныя скрыні, куды кожны можа пакласці ліст з прапановамі да ўлад. Як вынік — у людзей больш шанцаў, што іх голас пачуюць.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# Трапіць на хвалю індустрыяльнай рэвалюцыі

**У Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі абмеркавалі прыярытэты лічбавай трансфармацыі эканомікі і прамысловай палітыкі з нямецкімі калегамі. У дыялогу ўдзельнічалі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, бізнесмены і прадстаўнікі Федэральнага міністэрства эканомікі і энергетыкі Германіі. Асобную ўвагу ўдзялілі пытанню падтрымкі экспарту і прыцягненню прамых замежных інвестыцый.**

Паводле слоў **старшыні пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Андрэя РЫБАКА,** наша краіна пачынае ўваходзіць у чацвёртую прамысловую рэвалюцыю Industry 4.0. «Інтэрнэт рэчаў, дапоўненая рэальнасць — гэтымі паняццямі мы сёння толькі пачынаем апераваць. Калі мы спрабуем іх укараніць у заканадаўчую дзейнасць, нам неабходны вопыт, які атрымалі краіны з моцнай эканомікай і вялікай колькасцю рэсурсаў. Без разумення інавацый мы не атрымаем неабходнага эфекту для развіцця нашай эканомікі», — адзначыў у сваім вітальным слове Андрэй Рыбак.

На яго думку, укараненне інфармацыйных тэхналогій у прамысловасць дазволіць аптымізаваць работу шматлікіх працэсаў і скараціць шэраг выдаткаў. «Абмен думкамі з нашымі нямецкімі партнёрамі дазволіць нам зразумець, дзе беларуская прамысловасць сёння запатрабаваная і якую нішу яна зможа заняць у перспектыве. Сёння мы гаворым не пра высокія матэрыі, а пра канкрэтныя рэчы, якія дазволяць нам патрапіць у паток індустрыяльнай рэвалюцыі 4.0 і знайсці сваё месца ў гэтых працэсах», — рэзюмаваў Андрэй Рыбак.

**Кіраўнік прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Беларусі Уладзімір АЎГУСЦІНСКІ** лічыць, што лічбавая трансфармацыя эканомікі — гэта пытанне, якое востра стаіць перад многімі краінамі. «У Беларусі цяпер ідзе падрыхтоўка стратэгічнага дакумента ПВТ 2.0. У сваю чаргу Германія мае добры вопыт у гэтай сферы, і многія напрацоўкі з іх боку могуць быць цікавыя для Беларусі. Акрамя таго, у дзвюх краін шмат агульнага. Яны абедзве маюць падобныя структуры эканомікі — доля прамысловасці складае каля 25%. Для Беларусі таксама будзе цікавы вопыт Германіі па падтрымцы экспарту», — расказаў Уладзімір Аўгусцінскі.

Падчас сустрэчы прадстаўнікі Германіі падзяліліся сваім бачаннем праграмы лічбавай трансфармацыі, вопытам і напрацоўкамі ў гэтай сферы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

# Пасадзі сваё дрэва

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

З падобных спраў, накіраваных на паляпшэнне жыцця сваёй вёскі, пасёлка, пачынаецца выхаванне грамадзянскай пазіцыі маладога чалавека — лічыць **старшыня Жамчужненскага сельскага Савета дэпутатаў Валерый ГЕРМАН.**

Валерый Міхайлавіч расказаў, як у Жамчужным сёлета праводзілася акцыя «Пасадзі дрэва». Дзяцей у пачэснай справе прыйшоў падтрымаць член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу краіны, дырэктар птушкафабрыкі «Дружба» Васіль Маркевіч. Усе разам тады высадзілі шмат маладых дрэў. Паводле слоў старшыні сельскага Савета, гэта не першая такая акцыя, хутчэй, традыцыйнае мерапрыемства. Яшчэ вучні мясцовай школы ўзялі шэфства над помнікам, прысвечаным падзеям вайны. Яны пастаянна прыбіраюць тэрыторыю вакол мемарыяла, высаджваюць кветкі. Увогуле, без вучняў тут не праводзіцца ніводнае ўшанаванне ветэранаў, святочнае мерапрыемства на 9 мая.

АСАБЛІВУЮ ўвагу **старшыня раённага Савета дэпутатаў Сяргей ДЗЯДОВІЧ** звярнуў на развіццё валанцёрскага руху ў асяродку вучняў. Работа з хворымі, інвалідамі, састарэлымі, несумненна, выхоўвае ў дзяцей спагаду, цярпенне, уменне разумець іншага. І прыклады прагучалі даволі разнастайныя. Напрыклад, у Вольнаўскую бальніцу сястрынскага догляду вучні мясцовай школы прыходзяць разам са сваімі настаўнікамі. Часцей за ўсё гэта бывае на святы, на Каляды і Вялікдзень, на дзень пажылога чалавека. І вядома, пацыентам названай установы прыемна паглядзець канцэрт, адчуць сябе не забытымі, не пакінутымі. Але яшчэ важней у гэтай сітуацыі, што дзеці вучацца камунікаваць са старымі, нямоглымі людзьмі. Можа, пасля наведвання медустановы яны па-іншаму паглядзяць на сваіх дзядулю і бабулю, зразумеюць, што родных трэба шанаваць і берагчы.

Вучні Ляснянскай сярэдняй школы таксама ходзяць ва ўстанову для пажылых. У Лясной знаходзіцца інтэрнат для састарэлых і інвалідаў. Яшчэ ляснянскія школьнікі аказваюць дапамогу рэспубліканскаму анкалагічнаму цэнтру.

РАБОТА валанцёрскага атрада «Данка», створанага пры Гарадзішчанскай сярэдняй школе, заслугоўвае асобнай увагі. У Гарадзішчы ёсць інтэрнат для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. З 2014 года школьнікі ажыццяўляюць праект «Вясёлка дабра» пад дэвізам «Не побач, а разам». Яны праводзяць разам з хворымі дзецьмі спартландыі, тэатралізаваныя дзеі, ладзяць так званую клоўнатэрапію. Згаданыя справы з'яўляюцца адным з кірункаў дзейнасці валанцёрскага атрада. Дзейнасць атрада будуецца на дэмакратычных пачатках з поўнай рэалізацыяй самастойнасці юнага чалавека альбо групы дзяцей. Атрад прапануе любому ахвотнаму вучню сваёй школы разнастайныя віды сацыяльна значнай дзейнасці. У іх ліку бываюць акцыі грамадзянска-патрыятычнага кірунку, скажам гутарка на Дзень герба і сцяга. Жадаеш паўдзельнічаць у дыскусіі на тэму фарміравання здаровага ладу жыцця — калі ласка. Аматарам тэатральнага мастацтва даецца магчымасць прыняць удзел у пастаноўках, якія ладзяцца на самыя розныя тэмы.

Старшыня райсавета Сяргей Дзядовіч заўважыў таксама, што заслугоўвае ўвагі афармленне кутКоў дзяржаўнай сімволікі ў навучальных установах, якія наведалі ўдзельнікі выязной сесіі. Яны ёсць ва ўсіх школах раёна. Дэпутаты адзначылі асаблівую ролю бібліятэк устаноў адукацыі па вывучэнні сімволікі Рэспублікі Беларусь. Менавіта бібліятэкі арганізоўваюць тэматычныя выстаўкі, выстаўкі-прагляды, розная кшталту прэзентацыі па такіх тэмах, як «Геральдыка беларускай дзяржавы», «Дзень дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь». Важна, што на пералічаныя выстаўкі ходзяць малодшыя школьнікі, у свядомасці якіх павінна замацавацца павага да дзяржаўнай сімволікі, разуменне асаблівага месца нашай краіны ў свеце.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
*Баранавіцкі раён.*

# НА ХВАЛІ АПТЫМІЗАЦЫІ

***(Заканчэнне.
Пачатак на 1–й стар. «МС».)***

На сесіях абласнога Савета дэпутатаў разглядаліся пытанні аб змяненні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання раёнаў Мінскай вобласці. Аптымізацыя сельсаветаў прадыктавана часам. Усё, як кажуць, цячэ і мяняецца. І, бясспрэчна, патрабуе ўдакладненняў, новых падыходаў. Папярэдні аналіз паказаў, што аптымізацыя дасць магчымасць больш эфектыўна вырашыць пытанні канкрэтнай тэрыторыі з улікам эканамічных, сацыяльных, дэмаграфічных аспектаў, упарадкаваць работу дзяржаўных служачых. Пры гэтым абавязковая ўмова — на тэрыторыі новай аб'яднанай мясцовай адміністрацыі павінны знаходзіцца адна-дзве сельгасарганізацыі і пражываць не менш як 2 тыс. чалавек.

Дадам, што Мінская вобласць падышла да выканання адпаведнага даручэння кіраўніка дзяржавы адказна. Тут і да гэтага праводзілася аптымізацыя адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. У 2006 годзе такія змены адбыліся ў Салігорскім, Пухавіцкім, Мядзельскім раёнах, у 2007-м — у Клецкім і Бярэзінскім. У 2009 годзе ў цэнтральным рэгіёне былі скасаваны 32 сельсаветы. У Барысаўскім, Лагойскім, Мядзельскім, Старадарожскім і Слуцкім раёнах растлумачылі, што неабходнасць аб'яднання некаторых малаколькасных сельсаветаў пакуль яшчэ не наспела з розных прычын.

У выніку чарговай хвалі аптымізацыі ў 2013 годзе колькасць адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Мінскай вобласці зменшылася з 281 да 223. Цяпер тут налічваецца 216 сельскіх, 5 пасялковых і 2 гарадскія Саветы.

Вядома, перш чым прыняць рашэнне па аптымізацыі, галоўнае ўпраўленне арганізацыйна-кадравай работы Мінаблвыканкама, абласны Савет дэпутатаў вывучылі прапановы дэпутатаў раённых Саветаў, райвыканкамаў. На агульных сходах з удзелам прадстаўнікоў мясцовай улады сваё меркаванне наконт змен выказалі і жыхары рэгіёнаў. Не ўсе былі згодныя з узбуйненнем сельсаветаў. «Чаму менавіта нас далучаюць, а не суседзяў да нас?» — такое пытанне гучала падчас практычна ўсіх грамадскіх абмеркаванняў, дзе давялося пабываць. Людзей можна было зразумець: кожнаму хацелася застацца бліжэй да цэнтра сельсавета. Хвалявала іх і магчымае закрыццё сацыяльных, медыцынскіх, гандлёвых аб'ектаў, пытанні транспартных зносін з цэнтрам сельсавета.

> Сельсавет можа функцыянаваць у нармальным рэжыме, калі на яго тэрыторыі пражывае 2—4 тысячы чалавек. У Мінскай вобласці больш паловы сельсаветаў налічвае да 2 тысяч жыхароў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Мы зрабілі ўсё неабходнае, каб ліквідацыя сельсаветаў не пацягнула за сабой закрыццё аб'ектаў інфраструктуры, каб не знізілася прыцягальнасць населеных пунктаў, якасць паслуг, не пагоршылася становішча людзей, каб яны маглі без праблем дабрацца да цэнтра сельсавета. Там, дзе ўзнікла патрэба, асабліва ў аддаленых вёсках, арганізавалі дадатковыя маршруты грамадскага транспарту. Напрыклад, у Пухавіцкім раёне павярнулі аўтобус літаральна ў супрацьлеглы ад маршруту бок. Ён падвозіць людзей у цэнтр сельсавета і на зваротным шляху забірае дадому. У тым жа Пухавіцкім раёне ў вёсцы Браткава пакінулі спецыяліста сельсавета, які прымае жыхароў у канторы калгаса. Мы імкнуліся захаваць аб'екты сацыяльнай сферы паводле сацыяльных стандартаў. У прыватнасці, фельчарска-акушэрскі пункт мэтазгодна трымаць там, дзе пражываюць 600 чалавек. Але мы не закрылі медыцынскія ўстановы нават там, дзе налічваецца 200—300 чалавек. Людзі прывыклі да выгод, і мы не можам дапусціць пагаршэння іх становішча, узроўню жыццезабеспячэння, — расказаў **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван ЛІПНІЦКІ.**

Змяншэнне колькасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак пацягнула за сабой і скарачэнне штатаў. Разам з тым гэта паўплывала на якасны склад кадраў. Павялічылася колькасць маладых работнікаў, работнікаў з вышэйшай адукацыяй. Між іншым, знайшлося новае месца працы і для былых старшынь і спецыялістаў сельвыканкамаў.

Што датычыцца вызваленых будынкаў сельсаветаў, то сёння яны максімальна выкарыстаны пад сацыяльныя аб'екты і жыллё. Як правіла, будынкі месцяцца ў цэнтрах населеных пунктаў, знаходзяцца ў асноўным у добрым стане. Таму частка перайшла на баланс мясцовых сельгасарганізацый, частка прададзена на аўкцыёнах, некаторыя пакуль чакаюць гаспадара.

— І ўсё ж, ці будзе працягвацца аптымізацыя адміністрацыйных тэрыторый цэнтральнага рэгіёна? — пацікавілася ў Івана Ліпніцкага.

— Сельсавет можа функцыянаваць у нармальным рэжыме, калі на яго тэрыторыі пражывае 2—4 тысячы чалавек. У Мінскай вобласці больш паловы сельсаветаў налічвае да 2 тысяч жыхароў, — адзначыў мой суразмоўца. — Яны, па ідэі, павінны быць аб'яднаны. Але ў інтарэсах нашых грамадзян мы не пайшлі на гэты крок. У такім выпадку людзям будзе далёка дабірацца да цэнтра сельсавета. Мы выбралі іншы варыянт — скарацілі штаты. У многіх сельвыканкамах засталіся толькі адзінкі старшыні, кіраўніка спраў і галоўнага спецыяліста. Таму далейшае аб'яднанне, лічым, пакуль немэтазгоднае.

А як паўплывала ўзбуйненне тэрыторый на жыццё канкрэтнага рэгіёна?

— У 2009 годзе ў нас было 18 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, у 2013-м — 14. На сённяшні дзень засталося 8, у тым ліку адзін пасялковы Савет у Івянцы, дзе пражываюць пяць тысяч чалавек. Вядома, спачатку не ўсе жыхары аднязначна ўспрынялі наваўвядзенні. Было шмат пытанняў: як дабірацца да цэнтра сельсавета з аддаленай вёскі, як будзе арганізаваны прыём на месцах... Але з цягам часу, як кажуць, усе эмоцыі ўлягліся, — расказаў **старшыня Валожынскага раённага Савета дэпутатаў Сяргей ГЛІНСКІ.** — У прынцыпе нашы людзі не надта патрабавальныя. Галоўнае, каб да населенага пункта вяла добрая дарога, каб своечасова прыязджалі аўталаўка і хуткая дапамога, а фельчарска-акушэрскія пункты выконвалі сваю функцыю. Адзінае, мы скарацілі штат сельвыканкамаў, а будынкі перадалі на баланс гаспадарак, якія выкарыстоўваюць іх пад свае патрэбы.

Праўда, як прызнаўся Сяргей Францавіч, складаней стала працаваць старшыням сельвыканкамаў: вялікія тэрыторыі — у асобных выпадках да 80 кіламетраў. Напрыклад, у Валожынскім сельсавеце 85 вёсак, дзе пражывае 3950 чалавек. За адзін дзень усе не аб'едзеш, не сустрэнешся з кожным жыхаром. Як правіла, у састарэлых людзей няма ў доме інтэрнэту, каб накіраваць запыт у сельвыканкам па электроннай пошце. Звычайна яны выкарыстоўваюць тэлефонную сувязь. Па іх званках спецыялісты выязджаюць на месца, задавальняюць іх просьбы, выдаюць неабходныя даведкі. Дапамагаюць ім сацыяльныя работнікі.

— Зрэшты, нягледзячы на вялікую нагрузку, напружаную работу, работнікі сельвыканкамаў са сваімі абавязкамі і функцыямі спраўляюцца, кампенсуючы выдаткі, як кажуць, не колькасцю, а сваім прафесіяналізмам і ўменнем, — сказаў напрыканцы Сяргей Глінскі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

# ВЕДАЙ СВАЕ ГРАНІЦЫ

**Завершаны работы па нармалізацыі і ўстанаўленні граніц Мінскай вобласці і яе раёнаў. У выніку агульная плошча цэнтральнага рэгіёна зменшылася на 1780 гектараў, або на 0,04%.**

— Усталяванне граніц адміністрацыйных раёнаў і абласцей у Беларусі, а таксама вызначэнне іх плошчаў, упершыню было выканана ў 50-я гады мінулага стагоддзя графічным спосабам на аснове картаграфічнага матэрыялу, які меўся, — расказаў **намеснік начальніка землеўпарадкавальнай службы Мінаблвыканкама Уладзімір ГУМАРАЎ.** — Але з таго часу інфармацыя састарэла і патрабавала ўдакладненняў. Цяперашнія работы вяліся з прымяненнем сучасных тэхналогій: дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, метадаў атрымання і апрацоўкі фатаграфічных здымкаў і аблічбоўкі зямельнага пакрыцця.

> Напрыклад, па адзін бок трасы М1 поле належала Мінскай вобласці, па другі — Брэсцкай. Больш рацыянальна было перадаць яго аднаму рэгіёну, каб не пераганяць тэхніку, не траціць дадаткова паліва.

Выяўлена, што часта гэтыя граніцы немагчыма вызначыць на мясцовасці без прымянення спецыяльнага абсталявання. Яны не супадаюць з цвёрдымі контурамі: рэкамі, меліярацыйнымі каналамі, дарогамі, лясным масівамі, прасекамі, а ў многіх выпадках перасякаюць участкі сельгасугоддзяў, землі ляснога фонду.

— Як правіла, на такое размяшчэнне граніц паўплывалі меліярацыйныя і культуратэхнічныя работы, будаўніцтва аб'ектаў транспартнай інфраструктуры, змяненне ўмоў землекарыстання і іншыя аспекты, — тлумачыць спецыяліст. — Менавіта гэтыя абставіны і абумовілі неабходнасць устанаўлення дакладных граніц абласцей, раёнаў, а таксама ўдакладненне іх плошчаў. Мінская вобласць стала першапраходцам у гэтай справе, папярэдне пілотны праект быў апрабаваны ў Смалявіцкім раёне.

Асноўная мэта работ — вызначыць адзіныя, як правіла, апазнавальныя на мясцовасці граніцы для таго, каб забяспечыць больш эфектыўную арганізацыю дзяржаўнага рэгулявання і кіравання, функцыянавання суб'ектаў гаспадарання. Напрыклад, па адзін бок трасы М1 поле належала Мінскай вобласці, па другі — Брэсцкай. Больш рацыянальна было перадаць яго аднаму рэгіёну, каб не пераганяць тэхніку, не траціць дадаткова паліва. Або, у прыватнасці, адбываецца дарожна-транспартнае здарэнне, а ДАІ дакладна не можа вызначыць, каму належыць гэтая тэрыторыя. Ды і хуткую дапамогу невядома з якога раёна выклікаць.

Работы былі праведзены Рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «Праектны інстытут Белдзіпразем» ва ўзаемадзеянні з землеўпарадкавальнымі службамі райвыканкамаў і Дзяржаўным камітэтам па маёмасці ў адпаведнасці з даручэннем Савета Міністраў.

Аналагічныя мерапрыемствы павінны завяршыцца ў 2017 годзе ў Гродзенскай і Брэсцкай абласцях, у 2018-м — на Віцебшчыне, Магілёўшчыне і Гомельшчыне.

Мерапрыемствы па аптымізацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання Мінскай вобласці прайшлі грамадскае абмеркаванне, узгоднены са старшынямі раённых і абласнога выканаўчых камітэтаў. Мінскі абласны Савет дэпутатаў і мясцовыя Саветы прынялі рашэнні аб унясенні прапаноў аб усталяванні граніц рэгіёна, якія зацвердзіць сваім Указам кіраўнік дзяржавы. Праект дакумента падрыхтаваны.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# ПРАЦЭС ІДЗЕ. У МЯККІМ ВАРЫЯНЦЕ



## Як аптымізаваць сістэму адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення?

**З моманту набыцця суверэнітэту ў Беларусі практычна не змянялася сістэма адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення. Пры гэтым з пункту гледжання эканамічных рэалій, пад якія яна і падладжвалася, у краіне адбыліся некаторыя папраўкі — зніклі і з'явіліся сельскагаспадарчыя і прамысловыя прадпрыемствы, змянілася шчыльнасць насельніцтва... Ці мае сэнс сёння задумацца аб узбуйненні раёнаў і перападпарадкаванні іх адміністрацыям на больш высокім узроўні? Ці, наадварот, лепш раздзяліць вобласці на дробныя адзінкі, зыходзячы з эканамічнай практычнасці?**

### Сем разоў адмерай...

На думку **кандыдата эканамічных навук, загадчыка аддзела сусветнай эканомікі і знешнеэканамічных даследаванняў Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Таццяны ВЯРЦІНСКАЙ,** адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне краіны не заўсёды з'яўляецца аптымальным. «Сёння ў нас існуе розніца паміж гарадамі і раёнамі па колькасці насельніцтва, па эканамічным патэнцыяле, па сацыяльнай інфраструктуры. У ідэале мы павінны арыентавацца на комплекснае развіццё рэгіёнаў», — расказала эксперт. Гэта азначае, што жыхар у любым рэгіёне павінен быць забяспечаны работай, сацыяльнай інфраструктурай, якая адпавядае экалагічнаму асяроддзю. «У мяккім варыянце працэс аптымізацыі ўжо ідзе. Гэта можна назіраць на ўзроўні сельсаветаў, калі яны аб'ядноўваюцца, асабліва там, дзе ёсць маланаселеныя вёскі. Таксама можна казаць пра тое, што шэраг гарадоў абласнога падпарадкавання, такія як Пінск, Баранавічы, Бабруйск, могуць аб'ядноўвацца з адпаведнымі раёнамі. Можна яшчэ назваць і гарадскія цэнтры ў абласцях, якія таксама могуць аб'ядначца з адпаведным раёнам», — растлумачыла спецыяліст. Але яна лічыць, што спачатку трэба дэталёва вывучыць гэтае пытанне, таму што неабгрунтаванае рашэнне можа прывесці да пашырэння зон адказнасці, перанапружання кіраўніцкіх кадраў, зніжэння якасці выканання службовых абавязкаў.

### Аб надзённым і радыкальным

На думку эксперта, праблема, якую можна вырашыць у найбліжэйшы час, звязана з Мінскам. «Тут высокая канцэнтрацыя насельніцтва. Мы ведаем, што пачалі развівацца гарады-спадарожнікі. Калі яны будуць далей актыўна расці, то ўзнікне праблема кіравання імі. Такім гарадам патрабуецца свая ўласная адміністрацыя, якая дазволіць вырашаць мноства праблем у звязцы са сталіцай у рамках мінскай агламерацыі, якая фарміруецца», — растлумачыла Таццяна Вярцінская. Паводле яе слоў, на ўзроўні экспертаў абмяркоўваецца варыянт стварэння сталічнага рэгіёна. Ёсць сэнс у тым, каб аб'яднаць Мінск з прылеглымі тэрыторыямі, у якія ўключаліся б гарады-спадарожнікі, і гэта магло б стаць сур'ёзным крокам на шляху аптымізацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення.

На думку спецыяліста, навукоўцам вядомы і больш радыкальны варыянт — гэта поўнае перакройванне ўсёй адміністрацыйна-тэрытарыяльнай сеткі. «Калі мы звернемся да замежнага досведу, то заўважым, што часам тут можа дзейнічаць знешні фактар. Напрыклад, калі аб'ядноўвалася Еўропа, на ўзроўні наднацыянальных органаў паўстала пытанне аб неабходнасці ўніфікацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак па ўсёй тэрыторыі. Узнікала неабходнасць рэформаў. Такая рэформа была праведзена ў Польшчы, Літве», — расказала Таццяна Вярцінская. У Беларусі такога фактару пакуль няма. Калі ж з'явіцца неабходнасць у змяненнях, у сістэме кіравання эканомікай паўстане пытанне аб размежаванні функцый паміж абласным і раённым узроўнямі. Але навукоўцы ўжо адпрацавалі гэтыя мадэлі. Рэгіянальны ўзровень будзе адказваць за стратэгічныя кірункі, а раённыя будуць звязаны з забеспячэннем насельніцтва неабходным станам экалогіі, жыллёва-камунальнымі ўмовамі, дарожнай інфраструктурай. «Ёсць варыянт, які распрацоўваўся вельмі даўно навукоўцамі краіны. Калі гаворка ідзе пра пераход ад трохзвённай сістэмы (сельсавет, раён і вобласць, або першасны ўзровень, базавы і рэгіянальны) да двухзвённай. Гэта азначае, што замест шасці абласцей прапануецца каля 18 акруг, а замест сельсаветаў і раёнаў ствараюцца нізавыя ўзроўні, дзе больш актыўна будзе развівацца інстытут мясцовага самакіравання», — расказала Таццяна Вярцінская. Аднак, на яе думку, гэтая рэформа вельмі дарагая, бо змяняюцца ўсе дакументы, сістэма. Увасобіцца ў жыццё яна можа толькі пры ўмове крайняй неабходнасці, якой сёння няма.

«Магчыма, у гэтым з'явіцца неабходнасць, калі адбудзецца лічбавая трансфармацыя краіны і больш актыўна будуць выкарыстоўвацца інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі», — лічыць Таццяна Вярцінская.

Як адзначыў **Дырэктар інстытута эканомікі НАН, кандыдат эканамічных навук, дацэнт Валерый БЕЛЬСКІ**, пытанне змены меж тэрытарыяльных суб'ектаў краіны сёння не з'яўляецца першачарговым і актуальным. «Ёсць іншае важнае пытанне, якое заключаецца ў тым, каб змяніць некаторыя функцыі раённых адміністрацый. Часцей за ўсё кіраўніцтва ў раёне выконвае ў асноўным гаспадарчыя функцыі, падмяняючы паўнамоцтвы менеджараў прадпрыемстваў. Функцыянальнае ўдасканаленне мясцовай вертыкалі было б больш актуальным сёння», — рэзюмаваў Валерый Бельскі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

**Продавец:** ОАО «Витрайбыт», 211341, Витебская обл., Витебский р-н, аг. Вороны, ул. Ленинская, 36А, тел. +375 29 893-55-81

Лот №1. Капитальное строение с инв. №200/С-75469 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г. п. Яновичи, ул. Унишевского, д. 10, площадью 130,7 кв. м, наименование: комплексный приемный пункт, назначение: комплексный приемный пункт, расположенное на земельном участке с кадастровым №221256200001000434 площадью 0,0467 га. Составные части и принадлежности: ступеньки, сарай, уборная. Обременения: договоры аренды сроком по 15.12.2017, 29.12.2017, 31.06.2018, 05.11.2018, 08.03.2019, 30.06.2019, 02.01.2020. Нач. цена: 51 600 бел. руб. с учетом НДС. Задаток: 5 160 бел. руб.

Аукцион состоится 14.11.2017 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 11.10.2017 с 8.30 по 13.11.2017 до 17.30. **Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, BIC MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Срок заключения договора купли-продажи: 10 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и затраты по оценке имущества

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

**Предлагается к реализации:** Капитальное строение с инв. №200/С-86743 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, аг. Зароново, ул. Полоцкая, д. 14А, площадью 46,3 кв. м, наименование: здание комплексно-приемочного пункта, назначение: здание специализированное для бытового обслуживания населения. **Нач. цена:** 38 000 рублей без НДС. Конт. тел. +375 29 893-55-81.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению Молодечненского районного потребительского общества (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже следующих объектов недвижимого имущества:

**Лот №1: двухэтажное кирпичное здание «Универмаг»**, общей площадью **724,2 кв. м**, инв. №630/С-63424, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623855700003000225 (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью **0,1558 га**, по адресу: Минская область, Молодечненский район, **г. п. Радошковичи, ул. Виленская, 2**.

Объект находится в стадии реконструкции. Реконструкция объекта не завершена.

На земельном участке имеются ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (река Вязынка, река Гуйка, канал Вилейско-Минской водной системы) – площадь 0,1558 га, охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт – площадь 0,0125 га.

Начальная цена с НДС (20%) – **277 263,00** бел. руб. **Стоимость снижена на 10%.** Задаток 10% от начальной цены – 27 726,30 бел. руб.

**Лот №2: здание магазина «Хлебный»**, общей площадью **61,3 кв. м**, инв. №630/С-70118, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623855700002000125 (предоставлен на праве аренды) площадью **0,0121 га**, по адресу: Минская область, Молодечненский район, **г. п. Радошковичи, пл. Гастелло, 9**.

На земельном участке имеются ограничения: водоохранная зона реки Вязынка и канала Вилейско-Минской водной системы вне прибрежной полосы – площадь 0,0121 га. Указанное недвижимое имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона или продавца).

Начальная цена с НДС (20%) – **26 203,72** бел. руб. **Стоимость снижена на 20%.** Задаток 10% от начальной цены – 2 620,37 бел. руб. Указанное недвижимое имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона или продавца).

**Лот №3: здание магазина №56**, общей площадью **114,6 кв. м**, инв. №630/С-76929, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623855700002000146 (предоставлен на праве аренды) площадью **0,0228 га**, по адресу: Минская область, Молодечненский район, **г. п. Радошковичи, пл. Гастелло, 17**.

На земельном участке имеются ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (река Вязынка) – площадь 0,0228 га.

Начальная цена с НДС (20%) – **36 811,35** бел. руб. **Стоимость снижена на 20%.** Задаток 10% от начальной цены – 3 681,14 бел. руб.

**Лот №4: здание магазина**, общей площадью **490,9 кв. м**, инв. №630/С-74071, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623883505601000366 (предоставлен на праве аренды) площадью **0,1259 га**, по адресу: Минская область, Молодечненский район, Полочанский с/с, аг. Полочаны, ул. Вокзальная, 7.

Начальная цена с НДС (20%) – **82 857,40** бел. руб. **Стоимость снижена на 30%.** Задаток 10% от начальной цены – 8 285,74 бел. руб.

**Лот №5: здание магазина №10**, общей площадью **89,9 кв. м**, инв. №630/С-74362, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623882006601000038 площадью **0,0500 га**, по адресу: Минская область, **Молодечненский район, Лебедевский с/с, д. Малая Борковщина**.

На земельном участке имеются ограничения: охранная зона придорожных полос автомобильных дорог – площадь 0,0500 га.

Начальная цена с НДС (20%) – **2 740,00** бел. руб. **Стоимость снижена на 50%.** Задаток 10% от начальной цены – 274,00 бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с №3012108260016 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в следующем размере: по лоту №1 в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам №№2,3 – 5 (пяти) процентов, по лоту №№4–4 (четырех) процентов и по лоту №№5–10 (десяти) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 29.07.2017, 14.09.2017. Аукцион состоится **24.10.2017** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.10.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## Объявление о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества | Лот №1. Автомобиль OPEL ASTRA, 2000 года выпуска, регистрационный номер 5479ВК-2 Первоначальная стоимость – 3920,00 рублей. |
| Собственник (владелец) имущества | Исаченко Александр Евгеньевич |
| Местонахождение (адрес) имущества | Г. Орша, 2-й пер. Коммунальный, 2 |
| Информация об обременениях | Залог ЗАО «Идея Банк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 8<br>30 октября 2017 года в 11.00 |
| Справочная информация | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши<br>211030, г. Орша, ул. Островского, 36<br>Заведующий сектором – Чеканова Татьяна Николаевна, тел.: 80216543201, 80333996054.<br>Начальник отдела – Павлюченкова Наталья Евгеньевна, 80216543213 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши BY22AKBB36429030007942200000 АСБ Беларусбанк, г. Орша, код банка AKBBBY21215, УНП 300002505, не позднее 27.10.2017 г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от стоимости каждого лота.<br>В соответствии со ст. 97 Закона «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ о торгах

Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего Жерносекову Сергею Вячеславовичу.

Номер лота, вид выставляемого на торги имущества: Лот №1, автомобиль грузопассажирский вагон, марки «IVECO» 35C13V, 1999 года выпуска.

Наименование, начальная цена, местонахождение: автомобиль грузопассажирский вагон, марки «IVECO» 35C13V, 1999 года выпуска в количестве 1 шт., начальная цена – 12060,00 рублей, местонахождение – Могилевская область, Могилевский р-н, выезд на трассу Могилев–Гомель (М8), 245 км.

Имеющиеся обременения в отношении имущества – без обременений.

Место, дата и время проведения торгов: г. Орша, ул. А. Островского, 36, каб. 7; 27 октября 2017 г. в 11.00.

Справочная информация: Кириллова Элина Эдуардовна, судебный исполнитель, тел.: 8 (0216) 543217, 8 (033) 3998325, отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, адрес: ул. А. Островского, 36, г. Орша, адрес электронной почты opi_orsha@tut.by.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 24 октября 2017 г. на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши №BY22AKBB36429030007942200000, УНН 300002505, филиал №215 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, код AKBBBY21215.

Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).

В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем)

МЕРКАВАННІ

## У чым перавагі і недахопы аптымізацыі?

**З такім пытаннем мы звярнуліся да людзей, якія непасрэдна займаюцца гэтым кірункам у сваіх абласцях і раёнах.**

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ:**

— У нас у Віцебскім рэгіёне шмат маланаселеных пунктаў, у якіх пражывае каля 10—15 жыхароў. І ўзбуйненне сельсаветаў прайшло і таму, што скарачалася колькасць насельніцтва. Мінусам аптымізацыі сельсаветаў можна назваць велізарныя адлегласці паміж некаторымі вёскамі. Цяпер, каб дабрацца па даведку, вырашыць якое-небудзь пытанне, ажыццявіць розныя адміністрацыйныя працэдуры, — людзям даводзіцца ездзіць больш. Але: да гэтага моманту нейкіх масавых скаргаў ад насельніцтва мы не атрымліваем. Як мы гэта вырашылі? Па-першае, арганізавалі выязныя прыёмы, якія пастаянна праводзяцца ў вёсках. Работа пастаўлена так, каб зрабіць гэта ўзаемадзеянне камфортным. Разам з тым, недзе кропкава ўзнікалі пытанні, паколькі сельвыканкам знаходзіцца ў іншай мясцовасці. Але мы і гэта вырашалі: напрыклад, змянялі маршрут руху транспарту. Няма патрэбы, калі ў сельсавеце 500 жыхароў і ён раскіданы на вялікай тэрыторыі, утрымліваць цэлы штаб. Тым больш, што сёння ёсць магчымасць вырашаць пытанні і праз інтэрнэт. Што датычыцца плюсоў, то неабходна падкрэсліць, што выдаткі ў бюджэце сталі меншыя.

**Старшыня Валожынскага раённага Савета дэпутатаў Сяргей ГЛІНСКІ:**

— Вядома, асноўны плюс аптымізацыі — гэта скарачэнне дзяржаўных выдаткаў. Нас даволі сур'ёзна закрануў гэты працэс: у 2014 годзе ў нас засталося 7 сельскіх і 1 пасялковы Савет, а да гэтага было 14. А яшчэ да гэтага было наогул 18. Так, самая вялікая праблема — адлегласць да адміністрацыйных цэнтраў. У нас цяпер у сярэднім — па 50 вёсак на сельскі Савет, у двух — больш за 80 населеных пунктаў. Акрамя таго, у некаторых — па 3—4 гаспадаркі. Увогуле, тэрыторыя вельмі вялікая. Таму былі пытанні і з навядзеннем парадку на зямлі. Але сельскія Саветы дэпутатаў спраўляюцца, хоць ім і трохі цяжкавата. Як рэагавалі людзі? Яны не гарэлі жаданнем падтрымліваць аптымізацыю, бо пасля яе да цэнтра сельсавета стала доўга дабірацца. Паўсталі складанасці з адміністрацыйнымі працэдурамі — даведкамі, загсам. Зараз усё добра, спраўляемся.

**Старшыня Мастоцкага сельскага Савета дэпутатаў Магілёўскага раёна Валянціна МАЦЬКОВА:**

— У свой час да нас далучылі чатыры населеныя пункты — вядома, работа значна ўскладнілася, бо ў выніку стала 17 населеных пунктаў. Дарэчы, пакуль я асабіста дабралася толькі да трох з іх, цяпер хачу наведаць чацвёрты. Што я магу сказаць пра аптымізацыю? Гэтага не пазбегнуць. Лёгкіх шляхоў не шукае ніхто, мы да гэтага прывыклі, ды і патрабаванні пастаянна ўзмацняюцца. Аптымізацыя як была, так і будзе. Дарэчы, станоўчы эфект аптымізацыі — гэта тое, што мы сталі больш прыцягваць старастаў і дэпутатаў да работы, уборкі тэрыторый, вырашэння іншых пытанняў. Пашанцавала, што 4 населеныя пункты, якія далучылі да нас, апынуліся не далей, чым нашы 13. Гэта значыць, праблем з тым, каб дабрацца да адміністрацыйнага цэнтра, у нас няма.

**Старшыня Даўгалескага сельскага Савета дэпутатаў Гомельскага раёна Марыя ПУГАЧОВА:**

— Ой, гэта складанае пытанне. У нас 10 населеных пунктаў, і я лічу, што нас нікуды далучаць не трэба. І я хацела б, каб і да нашага сельсавета нікога не далучалі, таму што нагрузка будзе вельмі вялікая. А калі і далучаць, то мне неабходны яшчэ адзін спецыяліст, каб кантактаваць з гэтымі населенымі пунктамі і вырашаць разнастайныя пытанні. А наогул мне здаецца, што аб'ядноўваць варта толькі маленькія сельсаветы, ды і тое толькі тады, калі яны знаходзяцца побач. Што датычыцца аптымізацыі супрацоўнікаў сельвыканкама, то аптымізоўваць іх не трэба, таму што работы шмат. Арганізацый мноства, а мы адны — усім трэба даць інфармацыю. Напрыклад, у нас сёння працуе прыбіральшчыца на чвэрць стаўкі — плошча будынка невялікая. А вось з астатнімі пазіцыямі складаней: скарачаць бухгалтара не варта, паколькі вельмі шмат аперацый выконваецца, а рабіць гэта праз раён вельмі няпрэчна.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** lukashevich@zviazda.by

ЧАС РАБІЦЬ ВЫСНОВЫ

# ДВА Ў АДНЫМ

## Ці патрэбна аптымізацыя сельсаветаў, высвятляла карэспандэнт «МС» на прыкладзе Бабруйскага і Асіповіцкага раёнаў

**Любая аптымізацыя — гэта больш дасканалая форма гаспадарання. Але нават калі аб'ектыўна разумееш, што нешта трэба мяняць, рабіць гэта заўсёды няпроста. Асабліва тое датычыцца сельскай мясцовасці, дзе любыя спробы нешта зачыніць, абмежаваць успрымаюцца насельніцтвам як асабістая крыўда. Аляксандр Емяльянаў, старшыня Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў, адразу ж папярэдзіў, што аптымізацыяй не даводзілася займацца, але ён вельмі добра разумее, наколькі гэта адказны момант. У Бабруйскім раёне чатыры гады таму былі скасаваныя два сельсаветы — Гарохаўскі і Восаўскі. Іх населеныя пункты далучылі да Глушанскага і Гарбацэвіцкага сельсаветаў. Пераўтварэнні ішлі не вельмі гладка. Але прайшоў час, і цяпер можна рабіць нейкія высновы.**

### Восава — супраць

По дарозе ў Гарбацэвічы старшыня райсавета ўводзіць у курс справы. Маўляў, аптымізацыя адбылася пасля таго, як чатыры сельгасгаспадаркі аб'ядналі ў адзін філіял «Агракамбінат КХП» ААТ «Бабруйскі камбінат хлебапрадуктаў». Цяпер гаспадарка цалкам знаходзіцца ў межах Гарбацэвіцкага сельсавета. Абодва цэнтры былых сельсаветаў — Восава і Гарохаўка таксама ўвайшлі ў яго склад. За кошт аб'яднання колькасць населеных пунктаў у Гарбацэвіцкім сельсавеце павялічылася з 22 да 42.

> Нават колькасць паліва нам не павялічылі. Хоць тэрыторыя ўзрасла ў разы, ад нас да Восава ехаць і ехаць.

— Нагрузка неймаверна ўзрасла, — прызнаецца **кіраўнік спраў сельвыканкама Ніна РОСЛІК.** — Да аб'яднання мы абслугоўвалі 1600 чалавек, а зараз 2500. Пры гэтым штат сельвыканкама застаўся ранейшы — старшыня, кіраўнік спраў і спецыяліст. Матэрыяльная база таксама амаль не палепшылася. З Гарохаўкі нам толькі адзін камп'ютар перадалі і ўсё. Аўтамабіляў у гэтых сельсаветах не было. А нават калі б і былі — аднаму сельсавету дзве машыны мець не дазваляецца. Нават колькасць паліва нам не павялічылі. Хоць тэрыторыя ўзрасла ў разы, ад нас да Восава ехаць і ехаць. Я ўжо маўчу пра Старынкі, якія за Восавам. Там людзям бліжэй да іншага сельсавета, чым да нас.

Ніна Рослік успамінае, як насельніцтва абодвух сельсаветаў было супраць аптымізацыі. А восаўскае дагэтуль з ёй не змірылася. Транспартная сувязь з новым сельвыканкамам, мякка кажучы, не вельмі зручная.

— Нават інтэрнэт не дапамагае, — кажа суразмоўніца. — У сельскай мясцовасці не ўсе яго маюць, не ўсе могуць ім карыстацца. Гэта ж у асноўным пенсіянеры. Даведку можна і па тэлефоне замовіць, але ехаць па яе ўсё роўна прыйдзецца, бо трэба распісацца. Не дзіўна, што рэгістрацыя дамоў і зямель ідзе марудна.

Спецыяліст сведчыць: у сувязі з закрыццём сельвыканкамаў, населеныя пункты, дзе яны знаходзіліся, пачынаюць пакрыху паміраць. Яно і зразумела. Учара гэта быў цэнтр гаспадаркі, сельсавета, а стаў звычайны населены пункт. Вось у Гарохаўцы, напрыклад, пасля закрыцця сельвыканкама паступова скасавалі паштовае аддзяленне і школу.

### А Дойнічава ў захапленні

Глушанскі сельсавет застаецца адным з узорных і паспяховых нават пасля таго, як да яго далучылі 27 населеных пунктаў Гарохаўскага і Восаўскага саветаў з чатырма сотнямі чалавек насельніцтва. Гэта, вядома, толькі зарэгістраваныя жыхары, без уліку дачнікаў (якія дастаўляюць яшчэ больш клопатаў сваёй патрабавальнасцю). Пасля аб'яднання плошча сельсавета значна павялічылася, адлегласць паміж крайнімі вёскамі сёння складае 60 кіламетраў.

Але некаторыя жыхары ўсё ж выйгралі ад змяненняў. Напрыклад, вёска Дойнічава.

— Яна знаходзіцца ад нас усяго за два кіламетры, — кажа **Марыя СУШЧАНКА, старшыня Глушанскага сельскага Савета дэпутатаў.** — Летась падымалася пытанне аб арганізацыі маршруту Дойнічава—Глуша—Бабруйск, а сёлета ўжо пайшоў аўтобус. Вёска стала яшчэ бліжэй да нас. А раней яна адносілася да Восаўскага сельсавета. Тут няма адназначнага адказу, хто выйграў, хто прайграў. Але аптымізацыя — гэта непазбежны працэс. Колькасць сельскага насельніцтва зніжаецца з кожным годам.

### Рук на ўсё не хапае

Жыхары вёсак у любым выпадку абароненыя. Цяжар кладзецца ў асноўным на сельвыканкамы. Бо менавіта яны адказваюць за тое, каб людзі былі задаволеныя. Хоць сілы абмежаваныя. Бо сельсавет вялікі, а работнікаў у «апараце» толькі тры — старшыня, кіраўнік спраў і спецыяліст.

— Бюджэты аптымізаваных сельсаветаў павялічыліся, і за кошт гэтага мы за апошнія гады правялі шэраг глабальных мерапрыемстваў па наданні належнага выгляду вёскам, — кажа Марыя Сушчанка. — Іх, канешне, стала шмат, усе адразу не можам ахапіць, але ёсць прыклады, калі населеныя пункты цалкам відазмяняюцца. Людзі з іншых вёсак жадаюць, каб у іх гэтак жа было. Але мы выходзім з сваіх магчымасцяў. Канешне, калі б пры сельвыканкаме былі свае рабочыя, справа рухалася б хутчэй. Але пакуль нам прыходзіцца працаваць па дамоўленасці з цэнтрам занятасці і іншымі арганізацыямі.



Цяперашнія межы Глушанскага сельсавета.

—Я таксама лічу, што ў сельвыканкамах павінны быць рабочыя, — падтрымлівае калегу **старшыня Бабруйскага райсавета Аляксандр ЕМЯЛЬЯНАЎ.** — Старшыня, кіраўнік спраў і спецыяліст выконваюць свае функцыянальныя абавязкі. А для таго, каб нешта зрабіць па добраўпарадкаванні, трэба прыцягваць арганізацыі. Але сельвыканкам мае гаспадарчы інвентар — бензапілу, касілку і гэтак далей. Няма толькі людзей, якія б з ім працавалі. Калі горад узяць — там ёсць ЖКГ, прадпрыемствы, якое займаецца навядзеннем парадку на вуліцах, а «перыферыю» ніхто, акрамя нас, не абслугоўвае.


Гарбацэвіцкі сельсавет: колькасць ахвотных атрымаць даведкі ўзрасла ў разы.

Ёсць у старшыні райсавета заўвагі і наконт падыходу да правядзення аптымізацыі. Часцей за ўсё кіруюцца колькасцю насельніцтва, але трэба ўлічваць і іншыя фактары.

— Акрамя колькасці жыхароў, пажадана звяртаць увагу на плошчу тэрыторыі, наяўнасць дачнікаў і садаводчых таварыстваў. У нас у раёне іх, дарэчы, аж 79, — кажа Аляксандр Емяльянаў. — Яшчэ адна недарэчнасць — у тым жа Гарбацэвіцкім сельсавеце 42 населеныя пункты, а ў Брожскім сельсавеце толькі шэсць. Плошча Гарбацэвіцкага сельсавета 25 тысяч квадратных кіламетраў, Брожскага — 17 тысяч. Пагадзіцеся: нагрузка на сельсаветы розная, а колькасць работнікаў аднолькавая. Не заўсёды ўлічваецца і транспартны складнік, хоць ёсць населеныя пункты, дзе сувязь з сельвыканкамам дрэнная. Гэта таксама трэба ўлічваць.

### Сельсавет... на 500 жыхароў

У Асіповіцкім раёне на сёння налічваецца 12 сельсаветаў. Але ёсць намер правесці аптымізацыю. Наспела неабходнасць скасаваць адзін сельсавет — Карытненскі.

— Там у васьмі населеных пунктах пражывае ўсяго каля 500 жыхароў, — кажа **старшыня Асіповіцкага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр ПУЗІК.** — Становішча сельгасарганізацыі з аднайменнай назвай «Карытнае» стала цяжкім і яе аб'ядналі з больш паспяховай. Атрымалася адна гаспадарка на два сельсаветы. Гэта, пагадзіцеся, у наш час вельмі марнатраўна. Мы прапанавалі насельніцтву такі варыянт: адзін сельсавет скасаваць, а на былым месцы адміністрацыйнага будынка пакінуць спецыяліста, які б рашаў бягучыя пытанні.

На працягу месяца грамадзяне могуць выказваць прэтэнзіі. І яшчэ адно змяненне намячаецца ў Асіповіцкім раёне. Межы адной з тутэйшых сельгасгаспадарак змяніліся, і адна з вёсак трапіла ў сферу ўплыву іншага сельсавета. Яе і збіраюцца туды перадаць. Але перад гэтым абмяркуюць сітуацыю з насельніцтвам.

— Скарачэнне любога аб'екта на вёсцы негатыўна адбіваецца на яе жыцці, — канстатуе Аляксандр Пузік. — Але павінен быць рацыянальны дзяржаўны падыход. Я — за тое, каб гэта рабіць. У нас сёння Лапіцкі сельсавет — 28 вёсак і 2000 жыхароў. І побач сельсавет, дзе восем вёсак і 500 жыхароў. Зарплата ў старшынь аднолькавая, а нагрузкі зусім не супастаўныя. Гэта не вельмі добра. Дзяржава ж павінна неяк выдаткі скарачаць. Жыхары пры гэтым нічога не страцяць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
zigulya@zviazda.by

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НА КОТОРОЕ НАЛОЖЕНО ВЗЫСКАНИЕ В СЧЕТ НЕИСПОЛНЕННОГО НАЛОГОВОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | – капитальное строение, инв. №443/С-18571 (назначение – здание специализированное для металлургического производства и металлообработки, наименование – литейно-механический цех), площадью 117,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 23.<br>– капитальное строение, инв. №443/С-13731 (назначение – здание специализированное для металлургического производства и металлообработки, наименование – литейный цех), площадью 889,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 23. |
| Земельный участок, на котором расположен объект | кадастровый номер 425650100001003344, площадью 0,7885 га (назначение – земельный участок для содержания и обслуживания здания бывшей котельной) по адресу: г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 23 |
| Начальная цена продажи | 144 281,01 р. (сто сорок четыре тысячи двести восемьдесят один рубль одна копейка) |
| Сумма задатка | 14 428 р. (четырнадцать тысяч четыреста двадцать восемь рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Наименование подразделения департамента | Ошмянский межрайонный отдел управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь |
| Уполномоченный орган | ИМНС по Сморгонскому району |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка | Y44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 9 ноября 2017 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица, копия устава;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом в соответствии с шагом аукциона в размере 5 % от предыдущей цены до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязано возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней. Размер затрат доводится до сведения участников непосредственно перед торгами.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» от 18.04.2017 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений – 1 ноября 2017 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/*

## Переговоры по выбору подрядной организации

УП «Проектный институт «Белгипрозем» приглашает вас принять участие в переговорах по выбору подрядной организации для проведения работ по текущему ремонту.

Предмет закупки:

**Лот №1** – «Текущий ремонт помещений в здании по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 26»;

**Лот №2** – «Текущий ремонт помещений в здании по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 86А».

Примерный (укрупненный) перечень видов ремонтных работ (дефектный акт) можно получить у специалистов предприятия:

– Бейсова Г. Б. – тел. 279-95-77;

– Лукашевич А. Ф. – 279-95-90.

Переговоры будут проведены без предварительного квалификационного отбора.

Срок выполнения работ – 60 календарных дней.

Оплата ежемесячно – по факту выполнения работ.

Затраты, связанные с разъездным характером работ, или командировочные расходы не возмещаются.

Время проведения переговоров – 11.00 20 октября 2017 г.

Информация о переговорах и заявка на участие по тел.: 279-95-77, 279-95-90.

УНП 100035563.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НА КОТОРОЕ НАЛОЖЕНО ВЗЫСКАНИЕ В СЧЕТ НЕИСПОЛНЕННОГО НАЛОГОВОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. №443/С-20653 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – индивидуальный капитальный гараж), площадью 23,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, ул. Синицкого, 19/151, гараж, блок 5, Гаражно-строительный потребительский кооператив №11 г. Сморгонь |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 425650100001003578, площадью 2,6402 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания гаражей) по адресу: г. Сморгонь, ул. Синицкого, 19 |
| Начальная цена продажи | 3 159 р. (три тысячи сто пятьдесят девять рублей) |
| Сумма задатка | 316 р. (триста шестнадцать рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Наименование подразделения департамента | Ошмянский межрайонный отдел управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь |
| Уполномоченный орган | ОПИ Сморгонского района |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка | Y44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 9 ноября 2017 г. в 12.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица, копия устава;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом в соответствии с шагом аукциона в размере 5 % от предыдущей цены до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязано возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней. Размер затрат доводится до сведения участников непосредственно перед торгами.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» от 18.04.2017 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 1 ноября 2017 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/*

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению Государственного пограничного комитета Республики Беларусь (продавец), проводит открытый аукцион по продаже **помещения спортзала с инвентарным номером 620/D-18828 общей площадью 196,9 кв. м, расположенного на первом этаже пятиэтажного здания общежития по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Минская, д. 2/3-1 (далее – Объект).**

**Начальная цена – 33 650,29 бел. руб.** Задаток 10% от начальной цены – 3 365,00 бел. руб.

**Задаток перечисляется на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **15.11.2017** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.11.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НА КОТОРОЕ НАЛОЖЕНО ВЗЫСКАНИЕ В СЧЕТ НЕИСПОЛНЕННОГО НАЛОГОВОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Изолированное помещение, инв. №400/D-74816 (назначение – квартира, наименование – 4-комнатная квартира), площадью 88,7 кв. м, расположенная по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, д. 39, кв. 13 |
| Начальная цена продажи | 76 626 р. (семьдесят шесть тысяч шестьсот двадцать шесть рублей) |
| Сумма задатка | 7 663 р. (семь тысяч шестьсот шестьдесят три рубля) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Наименование подразделения департамента | Управление по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь |
| Уполномоченный орган | ОПИ Ленинского района г. Гродно |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка | Y44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 9 ноября 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица, копия устава;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом в соответствии с шагом аукциона в размере 5 % от предыдущей цены до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязано возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней. Размер затрат доводится до сведения участников непосредственно перед торгами.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» от 18.04.2017 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений – 1 ноября 2017 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/*

## Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Воропаевский ДОК»

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот №1.** Капитальное строение с инв.№222/С-11456, расположенное по адресу: Витебская область, Поставский р-н, Воропаевский с/с, г. п. Воропаево, ул. Заводская, 1, площадью 849,0 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание бытового корпуса, клуба, стоимостью 4200 белорусских рублей |
| Наличие обременений | нет |
| Местонахождение имущества | Поставский р-н., Воропаевский с/с, г. п. Воропаево, ул. Заводская, 1 |
| Место, дата и время проведения торгов | 13.11.2017 г. в 10.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб.2.5 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by)<br>Судебный исполнитель Богданова Ольга Евгеньевна тел/факс: (80212) 620340, (8033) 6879163 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 10.11.2017 г.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

УНП 300077686

ЭКАЛОГІЯ

# Чыста, эканамічна і... не пахне

## У Наваполацку пачалі выкарыстоўваць заглыбленыя кантэйнеры для збору цвёрдых бытавых адходаў

**Тэхналогія заглыбленага назапашвання і часовага захоўвання бытавога смецця зручная і эканамічна абгрунтаваная. Дзякуючы палімерным матэрыялам эксплуатацыя magazine различана на дзесяцігоддзі.**

— Асноўны прынцып гэтага метаду заключаецца ў вертыкальным размяшчэнні кантэйнера, які на 2/3 знаходзіцца пад зямлёй, — кажа **галоўны інжынер Біямехзавода бытавых другасных рэсурсаў Вадзім КУЛЯШОЎ.** — У Расійскай Федэрацыі мы закупілі за кошт сродкаў абласнога бюджэту 17 такіх кантэйнераў. Тэхналогія захоўвання смецця ў іх у першую чаргу зніжае затраты на абслугоўванне. Адзін заглыблены кантэйнер аб'ёмам 5 метраў кубічных замяняе 4–6 звычайных металічных, што павялічвае аб'ём сабранага смецця і змяншае колькасць разгрузак. Інтэрвал руху смеццявозаў павялічваецца, а гэта спрыяльна адбіваецца на кошце абслугоўвання.

Канструкцыя кантэйнераў дазваляе зменшыць плошчу, якую яны займаюць. Дыяметр люка для загрузкі адходаў невялікі — 500 мм, ёсць накрыўка, якая выключае распаўсюджванне смецця па ўсёй тэрыторыі. Асноўная частка бака знаходзіцца пад зямлёй, а значыць, падтрымліваецца пастаянная тэмпература, смецце не замярзае зімой і не гніе летам. Немагчыма і гарэнне смецця — ёсць сістэма пажаратушэння. Адсутнічаюць староннія пахі, выключаецца магчымасць траплення ападкаў.

Зараз падыходзяць да завяршэння ўпарадкаванне і падрыхтоўка да эксплуатацыі кантэйнерных пляцовак. Яны будуць мець сучасныя дызайн і эстэтычны выгляд. Вакол кантэйнераў лёгка падтрымліваць чысціню.

Для выгрузкі смецця прадпрыемства набывае ўніверсальны смеццявоз у камплектацыі з спецыяльнай устаноўкай, канструкцыя якой дазваляе нават не пад'язджаць ушчыльную да месца выгрузкі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*



# Каб зменшыць адходы, зазірні ў «Зялёную шафу»...

**Сэрвіс бясплатнай арэнды рэчаў для арганізацый «Зялёная шафа» створаны на базе Цэнтра экалагічных рашэнняў.**

Асноўная яго задача — папулярызаваць мерапрыемствы, заснаваныя на канцэпцыі «нуль адходаў», і дапамагчы некамерцыйным арганізацыям і ініцыятывам прытрымлівацца экалагічных прынцыпаў і падыходаў.

— Сама ідэя дзяліцца рэчамі не новая. Аналагічныя сэрвісы паспяхова існуюць як за мяжой, так і ў нас у Беларусі. Аднак мы хочам укараніць гэтыя прынцыпы ў карпарацыйную культуру кампаній нашай краіны, — распавядае куратар праекта, супрацоўніца праграмы па экалагічна дружалюбным ладзе жыцця Цэнтра экалагічных рашэнняў Марыя Сума. — Наш цэнтр ужо даўно дзеліцца рэчамі з арганізацыямі-сябрамі: Мінскім веласіпедным таварыствам, грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны», прыходам храма св. Мікалая Японскага, з такімі ініцыятывамі, як Freemarket, «Дзіцячыя майстэрні», дабрачынны праект «Калі ласка» і іншымі. Таму сэрвіс «Зялёная шафа» не быў утвораны спантанна.

Працуе ён проста: Цэнтр экалагічных рашэнняў выдзяляе шматразовы посуд, мэблю, тэхніку і іншыя неабходныя для мерапрыемстваў рэчы, яго спецыялісты тлумачаць нюансы, з якімі арганізатары могуць сутыкнуцца пры выбары экалагічнага фармату, дапамагаюць знайсці і арандаваць рэчы, якіх у базе няма. Ад арандатара, у сваю чаргу, патрабуецца як мінімум за два працоўныя дні да мерапрыемства запоўніць заяўку на сайце цэнтра ці патэлефанаваць, заключыць дагавор і забраць рэчы, абавязкова паведаміць удзельнікам аб тым, што мерапрыемства праводзіцца па прынцыпе «нуль адходаў», ну і, вядома, вярнуць рэчы ў цэласці.

Цэнтр экалагічных рашэнняў таксама адкрыты для супрацоўніцтва з фізічнымі асобамі і камерцыйнымі арганізацыямі, але ўмовы агаворваюцца асобна. Акрамя таго, цэнтр шукае кампаніі, гатовыя стаць спонсарамі рэчаў для сэрвісу «Зялёная шафа», каб падтрымаць ініцыятыву змяншэння колькасці адходаў на планеце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

ШТО Ў ВАС НОВАГА?

# САМЫ ЧАС РЫХТАВАЦЦА ДА ЗІМЫ

## Старшыні сельскіх Саветаў дэпутатаў расказалі пра тое, як добраўпарадкуюць давераныя ім тэрыторыі

**Сярэдзіна восені — самы час азірнуцца на тое, што было зроблена за цёплы перыяд, і ацаніць, які сёлета нас чакае ўраджай. І ў кожнага ён — свой. «МС» пацікавілася ў старшынь сельскіх Саветаў дэпутатаў пра тое, што было зроблена ў іх мясцовасці за апошнія летнія і асеннія месяцы.**

У Фарынаўскім сельскім Савеце дэпутатаў Полацкага раёна апошнім часам рыхтаваліся да Дня пісьменства, які сёлета адзначалі ў Полацку. Па словах **старшыні Савета Міхаіла ШУЛЬГІ,** шмат за мінулыя месяцы з'явілася ў акрузе скульптур. Тэрыторыю побач з імі ўпрыгожылі кветкамі, а таксама паставілі тры ампельныя вазы, якія напоўнілі камянямі. «Акрамя таго, памянялі агароджу, устанавілі новую працяглую 400 метраў. У канцы жніўня ў нас адбылося свята «Фарынаўская марка», якое мы праводзім ужо трэці год запар. Сёлета, напрыклад, зладзілі падчас яго парад дзіцячых калясак. Затым быў веласіпедны фестываль амаль для ўсіх узростаў: ад 7 гадоў да 80. Таксама правялі конкурс на лепшы голас Фарынава», — расказвае старшыня. Святы прайшлі, наперадзе — працоўныя будні. Сярод надзённых спраў сельвыканкама — абкошванне тэрыторый вёсак, навядзенне парадку ўздоўж дарог, падтрыманне ў добрым стане агароджы, ye замена ці афарбоўка. «І да зімы рыхтуемся, — кажа Міхаіл Шульга. — Будзем прыбіраць лістоту, даглядаць цеплатрасу, займацца яе добраўпарадкаваннем. Плануем пакласці 200 метраў асфальту побач са школай. Вядома ж, дапамагаем нарыхтаваць дровы састарэлым, глядзім, каб у іх былі добрыя ўмовы жыцця».

**Нэлі ГУСЕВА, старшыня Слабада-Кучынскага сельскага Савета дэпутатаў Капыльскага раёна,** расказала, што цяпер сельвыканкам у асноўным займаецца добраўпарадкаваннем грамадзянскіх могілак. «Прымаем аварыйныя дрэвы. Робім гэта ў вёсцы Русакі і Чарнічнае. Таксама робім абкошванне тэрыторый дамоў, якія пустуюць, калі неабходна — зносім. Працуем з насельніцтвам па прафілактыцы пажарнай бяспекі ў населеных пунктах, правяраем у асобных катэгорый грамадзян стан пячнога абсталявання. Таксама дапамагаем рыхтавацца да зімы: аднаму з састарэлых прывезлі гліну, а таксама спецыяліста, каб абтынкаваў печ. Разам з пажарнымі інспектарамі, сацыяльнай службай, аглядна камісіяй сельвыканкама праводзім сустрэчы з насельніцтвам, раздаём лістоўкі, дзе занатаваны прафілактычныя меры па пажарнай бяспецы».

**Старшыня Валосавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Акцябрскага раёна Леанід ЗАХАРАЎ** кажа, што займацца добраўпарадкаваннем могілак, даглядаць месцы пахавання мірных жыхароў, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны, даводзіцца ў асноўным за кошт энтузіязму, бо з бюджэту такія работы не фінансуюцца. «Рамонт, абслугоўванне збудаванняў могілак, робім у большасці за кошт сваіх сіл і з удзелам фінансавання ад насельніцтва — так званых добраахвотных узносаў. Так, летась мы сабралі 17 760 рублёў і гэтыя грошы цяпер выкарыстоўваем на набыццё будаўнічых матэрыялаў, а ўсе работы ажыццяўляем самі ці шукаем спосабы правесці іх бясплатна. Рука не падымаецца траціць грошы нашых жыхароў на аплату работ», — расказвае старшыня. Падобная карціна складваецца і з утрыманнем гістарычна памятных месцаў — помнікаў, якіх у сельсавеце 8. Іх таксама за кошт пазабюджэтных сродкаў тынкуюць і фарбуюць пры неабходнасці. «Сёлета збудавалі дзіцячую пляцоўку ў вёсцы Дзербін за кошт удзелу ў фінансаванні гаспадаркі, якая выдзеліла сродкі на набыццё арэляў і горкі. Таксама выкарысталі старое абсталяванне пляцовак, якое адрамантавалі і пафарбавалі, — расказвае Леанід Захараў. — Прыемна, што і насельніцтва актыўна далучаецца да добраўпарадкавання ўласных домаўладанняў, упрыгожваючы тэрыторыю кветкамі, новымі агароджамі і іншым, на што хопіць фантазіі і натхнення».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**
**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 10 кастрычніка 2017 года.**